№ 44 (690) 24 лістапада 2010 www.nn.by

# Наша Ніва

незалежная газета

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Усё пра выбары без цэнзуры

Старонкі 8—9



## Трагічная гібель прафесара Нікітчанкі

Старонка 7




## Візітоўка Лукашэнкі

Старонка 13

# Масква кліча беларусаў на Плошчу

Рэпартажы расійскага ТВ скончаюцца напамінамі пра «19-га а 19-й». **Старонка 3.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пасля рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты на плошчы чакалі іх прыхільнікі. Старонка 9.**

Тэндэнцыі

## Хто з кім не сустрэўся?

Па першых паведамленнях, гэта менавіта Лукашэнка адмовіўся прымаць Лаўрова 23 лістапада. Але потым ананімная крыніца ў Маскве паведаміла, што гэта Мядзведзеў забараніў Лаўрову кантакты з Лукашэнкам. **Старонка 3.**

## У НУМАРЫ

**Мядзведзь скінуў нашыйнік Пуціна**

Расія пацяшаецца: мо і Мядзведзеў скіне следам? **Старонка 13.**

**Мінчане скупляюць самыя танныя і самыя дарагія кватэры**

Будаўнічы рынак сталіцы ачуняў пасля крызісу. **Старонка 4.**

**«Юнімілк» наступае**

Найбуйнейшая малочная кампанія Расіі прыцэльваецца на Слуцк і Высокае. **Старонка 4.**

**Самаспаленне на балконе**

За тыдзень адбыліся аж дзве трагедыі. **Старонка 2.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**




## Трыумф плоці

Беларусь у здымках «Фатографа каралёў» Сашы Гусава. **Старонка 6.**

Палітыкаў-археолагаў можна вылучыць у асобны тып: Пазняк, Ткачоў, Чарнавол. Эсэ Алеся Кіркевіча «Смак пяску на зубах». **Старонка 12.**

## Жыццё і ліра Уладзіміра Дудзіцкага

Вязень «амерыканкі», жыхар Венесуэлы ў паваенны час, дырэктар радыё «Свабода», лавелас, мнагажэнец, піток, ён аднаго разу бясследна знік. Піша Анатоль Сідарэвіч. **Старонка 11.**

**Выбар-2010**

- **«Трэба, каб каманда рабіла кандыдату макіяж».** Сезон тэлевыступаў адкрыты.
- **Ярмошына адпомсціла Севярынцу за непацісНутую руку?** На рэгістрацыі кандыдаты вялі сябе па-рознаму, а Лукашэнка збаяўся.

**Старонка 8.**

## «Не адолеюць вас ні імперыялісты, ні камуністы»



Успаміны пра Уладзіміра Караткевіча. **Старонка 10.**

# Унікальны дакумент трапіў на таргі

На інтэрнэт-аўкцыён выстаўлялася рэгістрацыйная кніга найстарэйшага касцёла краіны.

На інтэрнэт-аўкцыён ay.by трапіў унікальны дакумент 1759 года — рэгістрацыйная кніга касцёла Святой Тройцы ў Ішкальдзі. Дакумент захаваўся ў добрым стане, апошні запіс у ім датуецца 1807 годам. На аўкцыёне за яго прасілі тры мільёны рублёў.

Прадавец кнігі пад нікам raritet заявіў, што набыў яе ў невядомай асобы.

Ішкальдскі касцёл (Баранавіцкі раён) — самы стары каталіцкі храм Беларусі. Там жывуць нашчадкі старадаўніх літвінаў, хрышчаных Ягайлам. Ад Ішкальдзі зусім блізка да Навагрудка — першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага.

Пробашч ішкальдскай парафіі а.Мацей Шматоўскі мяркуе, што, «калі дакумент належыць касцёлу, то яго трэба вярнуць». Але прызнае, што самастойна выкупіць кнігу яго парафія не здолее: «У нас старыя людзі».

Дыскусія акрэсліла некалькі важных пытанняў. Дзе павінны захоўвацца падобныя гістарычныя дакументы — у цэрквах і касцёлах ці ў архівах ды музеях, а то і ў прыватных зборах? Што важней — самі дакументы-рэліквіі ці інфармацыя, якую яны ўтрымліваюць? Ці не больш практычна са згоды ўласніка зрабіць копію каштоўнага дакумента, чым збіраць грошы на арыгінал?

Размовы былі доўгія, але ў выніку кнігі так ніхто і не набыў.

Уладальнік лота паведаміў, што болей яна на таргі выстаўляцца не будзе.

**Сямён Печанко**



**Ішкальдскі касцёл (пад Баранавічамі)** — самы стары каталіцкі храм Беларусі. Там жывуць нашчадкі старадаўніх літвінаў, хрышчаных Ягайлам. Ад Ішкальдзі зусім блізка да Навагрудка — першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. Касцёл быў закладзены ў 1472. Фундатар — смаленскі намеснік Мікалай Неміровіч і яго жонка Альжбета. Помнік каменнага дойлідства, выкананы ў гатычным стылі. У свой час пераходзіў да кальвіністаў, потым да праваслаўных.

КАМЕНТАР

## Старажытная кніга і сучасныя Шарыкавы

Ці могуць нацыянальныя каштоўнасці захоўвацца і ў прыватнай уласнасці?

Добра ведаю чалавека, які Ішкальдскую парафіяльную кнігу выратаваў ад вывазу з Беларусі ў пачатку 1990-х, выкупіўшы за шалёныя грошы ў нашчадкаў, што знайшлі яе сярод бабціных клункаў на гарышчы.

Цяпер гаспадар з розных прычынаў сабраўся прадаць кнігу. Мог бы незаўважна выставіць яе на расійскім «Малатку», дзе менш чым за 1000 даляраў прадаваліся кнігі з экслібрысамі бібліятэкі Радзівілаў. І тут пачаўся гвалт...

Кошт паставіў, як пацвердзяць калекцыянеры, не такі і высокі. Але купляць яе ніхто не збіраецца. Затое шмат хто зрабіўся пракурорам і суддзёй лёсу старажытнай кнігі. Дзіўная і пазіцыя ксяндза, які паабяцаў напісаць заяву пра крадзеж участковаму!

У вяртанні кнігі ў навуковы ўжытак павінны быць зацікаўленыя найперш архівы, а не касцёл. Бо толькі тамака дадзеныя запісаў будуць вывучаныя. Але супрацоўнікі архіваў не праглядаюць беларускія інтэрнэт-аўкцыёны. Ніводзін не звярнуўся да прадаўца з просьбаю зрабіць копію. А ўласнік кнігі быў бы не супраць.

У Беларусі ўжо ёсць прыклады развязання падобнага пытання — славуты пояс Вітаўта, які захоўваецца ў прыватнай уласнасці. На просьбу музеяў гаспадар перадае пояс у часовую экспазіцыю. Таксама гаспадар абавязаны дбаць пра ахову і сігналізацыю. Пояс нельга вывозіць за межы Беларусі і пры перапродажы гаспадар мусіць паведаміць дзяржаве пра новага ўласніка.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

# Самаспаленне на балконе

За тыдзень адбыліся аж дзве трагедыі: у Мінску і Гомелі.

Вуліца Цікоцкага — ціхая, хваёвая лесапаласа побач, недалёка — рачныя каналы. Тут, у доме нумар 18, і адбылася трагедыя. 41-гадовая Алена а 20-й гадзіне выйшла на балкон бацькоўскай кватэры, аблілася бензінам і падпаліла сябе. Маці спрабавала ратаваць дачку, але сама атрымала апёк 20% цела, цяпер ляжыць у шпіталі. У Алены застаўся пяцігадовы сын.

Суседзі па пад'ездзе не хочуць абмяркоўваць жахлівае здарэнне. Жанчына пераехала да бацькоў нядаўна, пасля разводу з мужам. Балюча перажывала разбурэнне сям'і. Кажуць, гэта і стала асноўнай прычынай самагубства.

Матывацыя, якую агучыў следчы пракуратуры, — «стомленасць ад жыцця». Самаспаленне, адзначыў ён, — рэдкі від суіцыду: за апошні год ведае толькі два выпадкі. Прытым што ў Першамайскім раёне сталіцы за год адбылося 56 суіцыдаў, якія скончыліся смерцю. Часцей за ўсё самагубцы вешаліся.

Яшчэ гэта — жорсткі спосаб. Алена мучылася ў бальніцы сем гадзінаў і сканала толькі а 3-й ночы.

На тым самым тыдні падобны выпадак адбыўся ў Гомелі. Муж пасля сваркі з жонкай абліўся бензінам і падпаліў сябе, але застаўся жывы — трапіў у рэанімацыю з апёкамі 25% цела. А ў ліпені чалавек падпаліў сябе ў адным з мінскіх сквераў, але быў адпраўлены ў рэанімацыю з апёкамі 70% цела.

Самаспаленне лічыцца «грамадскім» відам самагубства: як апошняя і галоўная акцыя пратэсту. У Празе ў 1969-м спаліў сябе, пратэстуючы супраць савецкай акупацыі, студэнт Ян Палах. У 1972 г. у літоўскім Коўне у знак пратэсту супраць таталітарызму спаліў сябе 19-гадовы рок-музыка Ромас Каланта. Так рабілі тыбецкія манахі, пратэстуючы супраць кітайскай палітыкі.

Чаму людзі наважваюцца на такое пасля побытавых канфліктаў? І чаго тут больш — жадання памерці або жадання пратэставаць?

«Самагубства мае на мэце выклікаць пачуццё віны ў кагосьці, — тлумачыць псіхіятр Ігар Сарокін. — У выпадку ж самаспалення да гэтага далучаецца яшчэ і жахлівасць спосабу — яно характэрнае для людзей з іншымі псіхічнымі захворваннямі, але гэта не абавязкова».

Усяго за 2009 год у Беларусі на сто тысяч насельніцтва прыходзілася 28,3 суіцыду. У рэйтынгу па колькасці самагубстваў у Еўропе Беларусь у лідарах.

«Для гэтага ёсць шмат фактараў, — кажа Сарокін. — Напрыклад, кліматычны (людзі паўночных краін увогуле больш схільныя да самагубства). А ёсць і тыя, якія можна змяніць. Напрыклад, у Беларусі слаба развітая сетка псіхалагічнай дапамогі для вяскоўцаў. А якраз сельскія жыхары больш схільныя да самагубства. А таксама высокі ўзровень алкагалізму ў краіне».

**Юрась Ускоў**

## Сцісла

• **Доўгачаканая зіма. 25 лістапада на большай частцы краіны — мокры снег, мяцеліца.** Тэмпература ад мінус да плюс 3°С. 26 лістапада пойдзе пахаладанне, снегапады, галалёдзіца. Тэмпература ноччу — да мінус 7°С.

• **Эксперты АБСЕ: Бябенін скончыў жыццё самагубствам.** «Дакументальна пацверджаны агляд месца здарэння, сабраныя на месцы здарэння прадметы, вынікі даследавання і аналіз сабраных матэрыялаў не даюць прычын сумнявацца ў высновах следства. Вусныя сведчанні, уключаныя ў матэрыялы справы, у тым ліку сваякоў, сяброў і калег, не далі ніякіх дадатковых фактаў ці доказаў», — гаворыцца ў паведамленні АБСЕ. Паводле меркавання экспертаў, вынікі анатаміравання і рэчавыя доказы, сабраныя на месцы здарэння, «ясна сведчаць, што прычынай смерці стала самагубства праз павешанне».

• **Бакіеў абвінавачаны ў саўдзеле ў масавых забойствах.** Пра гэта заявіў прадстаўнік дзяржабвінавачання на працэсе ў Бішкеку. Былога прэзідэнта і ягонага брата, які ўзначальваў ягоную ахову, вінавацяць у масавым расстрэле мітынгоўцаў падчас дзяржаўнага перавароту ў красавіку. Нагадаем, скінуты прэзідэнт Кыргызстана з неафіцыйнай жонкай і двума дзецьмі жыве ў Беларусі паводле запрашэння Аляксандра Лукашэнкі.

• **Новы Жыллёвы кодэкс увойдзе ў сілу не раней за 2012 год.** У у новым кодэксе будзе прапісаны механізм высялення грамадзян за працяглую неаплату або непагашэнне ўзятых у банку пазык. З'явілася і норма, у адпаведнасці з якой уласнік жылога памяшкання можа выселіць былога члена сям'і.

• **У Мінску аднаўляюць царкву Святога Духа.** У гэтым рэнесансавым храме, разбураным у 1936 годзе, пасля адбудовы размесціцца дзіцячая філармонія.

• **Кожны восьмы едзе «зайцам».** У Мінску 80% пасажыраў плацяць за праезд у гарадскім грамадскім транспарце рэгулярна. 7% робяць гэта раз ад разу, а 13% не плацяць амаль ніколі. На працягу 2011—2012 гадоў у сталіцы мяркуюць укараняць гнуткую сістэму тарыфаў, што дазволіць усталёўваць кошт паездкі ў залежнасці ад яе працягласці.

**СМ**

## Самае чытанае на nn.by за 17 — 23 лістапада

- Цырымонія рэгістрацыі: кандыдаты вялі сябе па-рознаму
- Лукашэнка згуляў у тэніс з Азаранка і Вазняцкі + фота і відэарэпартаж
- Краіна, дзе трыумфуе плоць
- У аўтакатастрофе загінуў Іван Нікітчанка
- Эратычны сялянскі каляндар
- Рымашэўскі ў жывым эфіры парваў партрэты Сталіна і Гітлера
- Графік выступаў кандыдатаў на тэлебачанні і радыё
- «Мядзведзь раптам скінуў нашыйнік прэм'ера» — навіна, якая парвала рунэт
- «Мы должны сообщать в райисполком обо всех, кто фотографирует»
- Расійскае ТБ кліча беларусаў на вуліцы 19 снежня

**nn@nn.by**

Каб тут былі «другія туры» —
Даўно б не стала дыктатуры.

**Кнехт**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Ад аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Міхалу М. са Стаўбцоўскага раёна.

Таццяне Я. з Койданаўскага раёна.

В.Ц. са Жлобінскага раёна.

Паўлу А. з Гомеля.

Змітру Г., Вользе Б. са Столінскага раёна.

Вадзіму Б. са Светлагорскага раёна.

Таццяне М., Валерыю П. з Баранавіцкага раёна.

Ігару Дз. з Брэста.

Н.С. з Вілейскага раёна.

# Масква кліча беларусаў на Плошчу

«Калі ў Беларусі кажуць «плошча», маюць на ўвазе вось гэта месца. Нешта накшталт украінскага майдана. Тут за скверыкам хаваецца Адміністрацыя прэзідэнта. Злева будынак, які ў народзе называюць саркафагам, але 19 снежня ў ім будзе працаваць Цэнтрвыбаркам. На плошчы сапраўды вельмі зручна чакаць вынікаў выбараў», — гэтымі словамі канчаўся вялікі рэпартаж пра Беларусь у навінах расійскага Першага тэлеканала.

«Гэта пачнецца ў 19 гадзін 19 снежня. У нас таму і заклік: 19-га ў 19 — на плошчу», — працягнуў лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў.

«На плошчы 19 снежня хутчэй за ўсё з'явіцца намётавае мястэчка. Але галоўны апазіцыйны кандыдат Някляеў кажа, што ён супраць сілавога варыянта змены ўлады. Беларуская рэспубліка цяпер — банкрут у эканамічным сэнсе, а рэжым Лукашэнкі слабы як ніколі. І нават міліцыя на акцыях пратэсту паводзіць сябе інакш», — гэтыя словы ўвогуле можна разглядаць як заклік да беларусаў прыходзіць на Плошчу.

Сёлета расійскія СМІ ўжо дзейнічалі ў падобным ключы, калі заклікалі людзей выходзіць на вуліцы Бішкека. У Кыргызстане такая тактыка спрацавала. Прэзідэнт Курманбек Бакіеў быў вымушаны ўцячы з краіны.

Але ці будзе гэты сцэнар удалым у выпадку з Лукашэнкам?

## Адмаўляецца падпісваць пагадненні

Падзеі апошняга тыдня сведчаць: ніякага мірнага пагаднення між афіцыйнымі Мінскам і Масквой быць не можа. Сітуацыя абвастраецца.

Спачатку Лукашэнка адмовіўся падпісваць План ужыцця рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі.

«Ніякія дакументы ў працоўным парадку я падпісваць не буду. Так і перадайце міністру абароны і прэзідэнту Расіі», — сказаў Лукашэнка расійскім вайскоўцам. Ён запатрабаваў бясплатных паставак узбраенняў і абмеркавання плана з кіраўніцтвам Расіі.

«Гэта не падыход, калі нам часам прапаноўваюць купляць узбраенне за свой кошт, ды яшчэ па рынкавай, як яны ўмеюць гаварыць, цане», — сказаў А.Лукашэнка.

На наступны дзень Мінск наведаў міністр замежных спраў Сяргей Лаўроў. Але сустрэчы з беларускім лідарам у яго не было.

Па першых паведамленнях, гэта менавіта Лукашэнка адмовіўся прымаць Лаўрова. Але потым ананімная крыніца ў Маскве паведаміла, што гэта Мядзведзеў забараніў кантакты з Лукашэнкам.

Дарэчы, сустрэча Лукашэнкі і Мядзведзева можа адбыцца ў першай палове снежня ў часе сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў Мытнага саюза.

Мяркуецца, што падчас яе будзе падпісанае пагадненне па Адзінай эканамічнай прасторы. АЭП, як і Мытны саюз — пешчаныя дзеці Пуціна.

З дапамогай гэтых утварэнняў ён спадзяецца надзейна прывязаць беларускую і казахскую эканоміку да Расеі. Ён мяркуе, што такім чынам з часам створыцца «расейскі свет», альтэрнатыўны Еўрасаюзу. Украіна і Малдова не маюць намеру далучацца да АЭП.

## «Павінны быць беларускія сцэнары, а не навязаныя»

Амаль усе апазіцыйныя кандыдаты згодныя, што людзей трэба клікаць на Плошчу. Гэтай пазіцыі прытрымліваюцца Уладзімір Някляеў, Андрэй Саннікаў, Віталь Рымашэўскі, Яраслаў Раманчук, Мікола Статкевіч. Катэгарычна супраць гэтага Алесь Міхалевіч. Не да канца ясная пакуль пазіцыя Рыгора Кастусёва.

Ёсць такія, як лідар «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч, якія перакананыя ў тым, што трэба выкарыстоўваць любую магчымасць Плошчы. І не важна, ад каго ідзе імпульс да яе.

А вось лідар Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч больш асцярожны. З аднаго боку ён кажа, што трэба выходзіць на вуліцу, каб патрабаваць выканання закона. «З іншага боку — гэта павінны быць унутраныя беларускія сцэнары, а не навязаныя збоку», — на думку Мілінкевіча, магчымасць другога варыянта цалкам рэальная. Іншымі словамі, экс-кандыдат кажа пра немагчымасць падтрымкі Плошчы, што будзе арганізоўваць Масква.

«Аб'яднанне вакол адзінага мабілізуе. Мноства кандыдатаў паніжае пратэставы градус у грамадстве», — мяркуе палітык.

«Шмат якія людзі яшчэ не ўсведамляюць, што фокусы не праходзяць. Што нечага вось такога раптоўнага быць не можа», — кажа А.Мілінкевіч.

Фармальнай нагодай для рэпартажу на расійскім Першым канале была рэгістрацыя кандыдатаў. Пачынаецца сюжэт з абсурднага роліка, у якім сябры БРСМ заклікаюць ісці на «выбары–дурыбары».

Журналістка Кацярына Кібальчыч кажа, што народ у Беларусі чакае крызісу. Што ля абменнікаў стаяць чэргі.

Была згаданая нядаўняя заява Далі Грыбаўскайце. «10 гадоў таму прадстаўнікі беларускай апазіцыі спальвалі расійскі трыкалор у цэнтры Мінска. А цяпер сцяг Еўрасаюза на прэс–канферэнцыі апазіцыі выглядае канфузам. Двух галоўных незалежных кандыдатаў у Мінску сёння называюць прарасійскімі. І яны гэтага не саромеюцца», — маюцца на ўвазе Андрэй Саннікаў і Уладзімір Някляеў.

«Трэба зыходзіць з рэальнай сітуацыі. Калі ў Еўропе гавораць аб падтрымцы Лукашэнкі, а ў Расіі — апазіцыі, то трэба гэта ўлічваць і вітаць», — кажа на гэта Саннікаў.

Потым Лукашэнку параўноўваюць з цыганом з фільма Эміра Кустурыцы.

«Сацапытанні паказваюць, што ў першым туры Лукашэнка выбары выйграць не зможа», — гаворыцца ў рэпартажы.

## Уплыў расійскіх медыяў падае

Журналіст, медыяэксперт Паўлюк Быкоўскі, у сваю чаргу, зазначае, што ўплыў расійскіх тэлеканалаў на беларускую аўдыторыю «вельмі абмежаваны».

«Расійскія СМІ ў нас у асноўным прадстаўленыя тэлеканаламі, але іх эфір ужо паспяхова запаўняецца беларускім кантэнтам. Што датычыць газет, то 90% друкуецца на тэрыторыі Беларусі даччынымі прадпрыемствамі. Ніякімі рэтранслятарамі думак Крамля яны, зразумела, не з'яўляюцца», — кажа П.Быкоўскі.

Што датычыць самога рэпартажу на Першым тэлеканале, то Паўлюк Быкоўскі мяркуе, што яго маглі не пабачыць тыя людзі, якім ён непасрэдна адрасаваўся. Заклікі кандыдатаў выходзіць на Плошчу могуць быць больш эфектыўнымі, падсумоўвае П.Быкоўскі.

## Пытанні Плошчы

Што да самой Плошчы, то яна таксама выклікае пытанні. Чаго будуць дамагацца пратэстоўцы? Другога тура? Новых выбараў? Калі другога тура, то хто назаве імя яго удзельнікаў? Ярмошына? Ці Плошча будзе спосабам сілавога ціску на ўлады?

У штабах кандыдатаў кажуць, што планы яны маюць, але пакуль ніякіх сакрэтаў не выдаюць.

«У найноўшай гісторыі Беларусі толькі нацыянальная ідэя выводзіла людзей на вуліцу. У 2006-м людзі выходзілі за праўду, за свабоду, супраць рэпрэсій. А сёлета і на Плошчы будуць прыгадвацца заклікі да інтэграцыі з Расіяй», — мяркуе палітолаг Юры Чавусаў.

Актывіст апазіцыі з Салігорска Павел Батуеў быў удзельнікам Плошчы 2006 года. Кажа, што збіраецца пайсці на яе і сёлета, але пакуль не ведае навошта.

**Зміцер Панкавец**

# Як маладафронтаўцы міністра не пазналі

Мікола Дземідзенка і Наста Палажанка 13 лістапада расклейвалі налепкі «Сыходзь» у цэнтры Мінска. «Дзесьці каля будынка МУС насустрач ішоў вусаты мужчына, які ўсміхаўся нам. Мне ягоны твар падаўся знаёмым, — расказвае М.Дземідзенка. — Я падаў яму руку, ён паціснуў.

Потым мужчына пачаў ганіць нас, што гэта адміністрацыйнае правапарушэнне. Я адказаў, што так, дзядзька, мы больш не будзем. На гэтым і разышліся».

Каля ГУМа маладзёнаў затрымаў спецназ. «Я пытаюся: гэта нас вусаты здаў? Яны кажуць: ці ведаеце, хто гэта быў? Аказваецца, што міністр унутраных справаў Анатоль Куляшоў. У Цэнтральным РУУСе ўсе ўжо ведалі пра здарэнне», — расказвае Мікола.

У пастарунку хлопца і дзяўчыну пратрымалі нядоўга. Адпусцілі нават без складання пратаколаў.

**ЗП**

**Акцыя «Сыходзь»**

Вулічная акцыя 24 лістапада запланаваная на 18–ю гадзіну на Кастрычніцкай плошчы. Яна пройдзе ў форме сустрэчы з кандыдатамі. Браць удзел у мерапрыемстве мае намер большасць апазіцыйных кандыдатаў. Акцыя «Сыходзь» прымеркаваная да гадавіны рэферэндуму 1996 года, які паклаў пачатак аўтарытарызму ў нашай краіне.

# Алена Танкачова: Козік патрабаваў прыняць Беларусь у ЕС

18—19 лістапада ў Берліне прайшоў другі Форум грамадзянскай супольнасці, які аб'ядноўвае дзясяткі недзяржаўных арганізацый з шасці краін-удзельніц «Усходняга партнёрства». Кіраўнік Цэнтра прававой трансфармацыі Алена Танкачова была ўдзельніцай гэтай сустрэчы.

«У рамках эканамічнай платформы найбольш гаворкі было пра свабодныя зоны гандлю. Што цікава, старшыня лукашэнкаўскай Федэрацыі прафсаюзаў Леанід Козік уздымаў два пытанні: вяртанне Беларусі гандлёвых прэферэнцый ЕС і, у палітычным плане, прыём Беларусі ў Еўрасаюз. Калі ў выніковай рэзалюцыі гэтых прапановаў не аказалася, то Козік пачаў абурацца».

**Гутарыў ЗП**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Дзяцей скарысталі ў агітацыі за Лукашэнку




Гэта здарылася падчас матча брэсцкага «Дынама» і «Белшыны».

Футбалісты перад гульнёй выводзілі на стадыён дзяцей. Гэта звычайная міжнародная практыка. Але вось якія майкі былі на тых дзяцей — з надпісамі «НАШ прэзідэнт». А гэта катэгарычна пярэчыць міжнародным нормам.

Высветлілася, што аўтарам ідэі стаў жыхар Брэста Георгій Дарбуашвілі, ураджэнец Асеціі. Тут заснаваў жаночы футбольны клуб «Вікторыя».

У Брэсце ён мае рэпутацыю дзівака. Возіцца з дваровым футболам. А сёлета стаў дэпутатам гарсавета. Дзеці былі якраз з ягоных каманд.

«Вы бачылі, што дзеці выходзілі ў майках з партрэтам прэзідэнта? Асабіста я — не. Ніякіх штрафных санкцый у дачыненні да клуба прымяняць не збіраемся», — зазначыў старшыня Беларускай федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас, былы кіраўнік Адміністрацыі Лукашэнкі.

**ЗП**

## Сцісла

• **Даля Грыбаўскайце: Гарант стабільнасці Беларусі — гэта яе людзі.** Прэзідэнтка Літвы заявіла, што яна будзе супрацоўнічаць з тым прэзідэнтам, якога абярэ народ Беларусі. Раней была распаўсюджаная заява, што Грыбаўскайце зычыць на прэзідэнцкіх выбарах перамогі Аляксандру Лукашэнку як гаранту незалежнасці.

• **Прыязджаў прадстаўнік амерыканскага Дзярждэпа.** Мінск наведаў намеснік памочніка дзяржсакратара ЗША Дэніэл Расэл. У адрозненне ад еўрапейскіх палітыкаў, ніякіх абяцанняў афіцыйнаму Мінску Расэл не даваў. Падчас візіту ён сустракаўся з міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым і апазіцыйнымі кандыдатамі ў прэзідэнты.

• **Хамайду нечакана выпусцілі з-пад арышту.** Пасля таго як яму прысудзілі 5 сутак зняволення за арганізацыю пікету з заклікам байкатаваць выбары, рашэнне суда апратэставала пракуратура. Віцебскі апазіцыянер кажа, што сам у пракуратуру не звяртаўся. Спадар Хамайда сваё нечаканае вызваленне тлумачыць так: «Суддзя «перастаралася», не зразумеўшы, што трэба дэманстраваць усебаковую лаяльнасць падчас агітацыйнай кампаніі».

**ЗП**

# Мінчане скупляюць самыя танныя і самыя дарагія кватэры

Будаўнічы рынак сталіцы ачуняў пасля крызісу.

Рыэлтары адзначаюць, што найбольшым попытам карыстаюцца самыя танныя і самыя дарагія кватэры. Продажы элітнага жылля прыпыніліся ў сувязі з крызісам, але цяпер зноў актыўна развіваюцца. Па словах намесніка дырэктара ЗАТ «Універсальные юрыдычныя паслугі» Арцёма Вайніловіча, кватэры ў доме «Ля Траецкага» паспяхова раскупляюцца беларускімі мільянерамі.

Нагадаем, што забудоўшчыкам аб'екта выступае кампанія «Трайпл» Юрыя Чыжа, а само будаўніцтва дома ў гістарычнай частцы горада выклікала абурэнне і пратэсты з боку Таварыства аховы помнікаў.

Напрыклад, з васьмі самых дарагіх кватэр на верхніх паверхах свабоднай засталася пакуль што ўсяго адна — плошчай 300 квадратных метраў і цаной $750 тысяч. Сем астатніх — такія ж альбо нават даражэйшыя за мільён даляраў — ужо знайшлі купцоў.

Самыя танныя кватэры ў гэтым доме каштуюць ад $180 тысяч.

### Людзей цікавяць малыя планіроўкі

На іншым канцы спектра найбольшым попытам карыстаюцца маленькія па колькасці квадратных метраў кватэры. 1-пакаёвыя — да 40 кв.м, 2-пакаёвыя — да 60 кв.м, 3-пакаёвыя — да 80 кв.метраў. Такія кватэры ў дэфіцыце, і гэта дакор айчынным праекціроўшчыкам, якія не ўлічваюць патрэбы патэнцыйных кліентаў.

«На аднапакаёвыя кватэры, як правіла, прэтэндуюць сталыя людзі, яны набываюць жыллё для сваіх дзяцей, — мяркуе намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу групы кампаній «Юнівест-М» Ганна Лукашэнка. — Вельмі высокі попыт па гэтай катэгорыі з боку рэгіёнаў. 2-пакаёвыя кватэры выбіраюць людзі сярэдніх гадоў і маладыя сем'і без дзяцей. 3-пакаёвыя набываюць маладыя забяспечаныя пары з дзецьмі, і для іх найбольш актуальнае пытанне крэдыту».

На якія пытанні перадусім звяртаюць увагу пакупнікі пры выбары кватэры? «Наступнымі аргументамі пасля цаны квадратнага метра для людзей з'яўляюцца тэхналогіі будаўніцтва, наяўнасць парковак і магчымасць крэдытавання», — працягвае жонка прэзідэнцкага сына Дзмітрыя Лукашэнкі.

Дарэчы, ён і ягоны Прэзідэнцкі спартыўны клуб маюць дачыненне да фінансавання «Юнівест-М», дзе працаўладкавалася жонка.

### Дэвальвацыя прымушае будавацца

Рыэлтары не баяцца, што знікне попыт на жыллё праз яго залішнюю дарагоўлю. У чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоваў у адной толькі сталіцы стаяць 270 тысяч сямей. Вядома ж, далёка не ўсе з іх насамрэч збіраюцца будавацца.

«Я думаю, што многія льготнікі насамрэч не маюць моцнай патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, як кажуць іх дакументы, — выказвае сваё меркаванне Арцём Вайніловіч. — Думаю, значная частка людзей гатовая ўвайсці ў будаўніцтва толькі пры відавочнай матэрыяльнай выгадзе». Чуткі пра тое, што льготнае крэдытаванне хутка спыніцца, прымушае людзей будаваць кватэры як мага хутчэй.

«Чым далей ад Мінска, тым страшнейшыя страшылкі пра магчымую дэвальвацыю, таму іншагароднія грамадзяне часта прыязджаюць у сталіцу і ўкладваюць свае ашчаджэнні менавіта ў квадратныя метры», — кажа Арцём Вайніловіч. На цяперашні момант у сталіцы прадаюцца кватэры ажно ў 84 новабудоўлях.

**Яўген Васількоў**

## Нафтавая разнастайнасць

Лукашэнка спрабуе дамовіцца пра пастаўкі нафты з Азербайджана.

Сустракаючыся з прэзідэнтам Дзяржаўнай нафтавай кампаніі Азербайджана Раўнагам Абдулаевым, кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў пастаўляць азербайджанскую нафту ў нашу краіну.

«Мы разглядаем любыя варыянты супрацоўніцтва з Азербайджанам па вуглевадароднай сыравіне. Я маю на ўвазе пастаўкі ў Беларусь азербайджанскай нафты па своп-схеме, замяшчаючы венесуэльскую нафту, якая будзе прадавацца на амерыканскім рынку», — заявіў Лукашэнка. Ён бачыць у гэтым узаемавыгаду: «Вы выйграеце дзясяткі даляраў на кожнай тоне, мы таксама выйграём. Гаворка ідзе аб прапампоўванні вашай нафты на нашы заводы па нафтаправодзе «Адэса — Броды» з выхадам на «Дружбу», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Пра рэакцыю азербайджанскага боку не паведамляецца.

Ідэя выглядае ажыццяўляльнай. Менавіта такім чынам эксперты ўяўлялі супрацоўніцтва Беларусі з Венесуэлай — чавесаўскалукашэнкаўская нафта прадаецца амерыканцам, а паліва з нейкай іншай краіны паступае ў Беларусь. Тым самым змяншаюцца транспартныя выдаткі — Азербайджан нашмат бліжэйшы за Венесуэлу.

### Украіна адшыла расіян

Праверыць, наколькі ідэя рэальная ў тэхнічным плане, дапамагла пробная прапампоўка нафты праз украінскі трубаправод «Адэса—Броды», якая пачалася 20 лістапада.

З Бродаў нафта перацячэ па магістральным нафтаправодзе «Дружба» на Мазырскі НПЗ. Цікава, што Украіна не дазволіла расійскай кампаніі «Транснафта» назіраць за пробным прапампоўваннем, хоць тыя і прапаноўвалі сваю дапамогу.

Расіяне хвалююцца, што запуск «Адэса — Броды», які з'яўляецца часткай адзінай сістэмы трубаправодаў, у аверсным рэжыме можа негатыўна адбіцца на ўсёй сістэме, у тым ліку на пастаўках расійскай нафты па нафтаправодзе «Дружба» ў Еўропу.

### Азербайджан будзе не адзіным?

Беларуска-ўкраінскі кантракт аб транзіце нафты па трубаправодзе Адэса — Броды ў аверсным рэжыме быў заключаны да канца 2013 года.

Як заяўляў віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка, пастаўкі плануецца ажыццяўляць на ўмовах своп з выкарыстаннем нафты з розных краін. «Па нафтаправодзе будзе прапампаваная іншая, не венесуэльская, нафта», — падкрэсліваў ён. Сітуацыя з азербайджанскім палівам паказвае сур'ёзнасць такіх намераў.

**ЯВ**

## Насельніцтва чакае дэвальвацыі, масава скупляе валюту

Чысты попыт на наяўную валюту ў кастрычніку вырас у 11 разоў.

Чыстая купля беларусамі замежнай валюты за месяц склала $317,2 мільёна. Між тым, у верасні гэты паказчык складаў $62,8 мільёна. Такая паніка на валютным рынку звязана з масавымі чаканнямі дэвальвацыі. Як вядома, дэфіцыт бягучага рахунку Беларусі дасягнуў рэкорднага памеру. Ад новага года сітуацыю можа пагоршыць чарговы рост цэнаў на расійскія нафту і газ.

## Расійскі «Юнімілк» акупуе малочны рынак Беларусі

Найбуйнейшая малочная кампанія Расіі прыцэльваецца на Слуцк і Высокае.

Галоўны расійскі вытворца малочнай прадукцыі і дзіцячага харчавання «Юнімілк» працягвае актыўна развіваць бізнэс у Беларусі. Услед за стварэннем сумесных прадпрыемстваў у Шклове і Пружанах расійскія малочнікі маюць намер наладзіць вытворчасць у Слуцку і Высокім.

«Юнімілку» з 2009 года ў Беларусі належаць кантрольныя пакеты акцый (51%) у кампаніях «Юнімілк Шклоў» і «Юнімілк Пружаны». На Беларускім інвестфоруме ў Франкфурце-на-Майне «Юнімілк» падпісаў інвестыцыйнае пагадненне з Мінскім аблвыканкамам аб стварэнні экспартаарыентаванага кластара па вытворчасці сыроў і малочных кансерваў на базе ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» і актываў ААТ «Слуцкі піваварны завод». Агульны аб'ём інвестыцый у праект складзе каля 80 мільёнаў еўра ў перыяд да 2017 года.

Але Слуцк — не адзінае новае месца ў расійскай малочнай імперыі. У канцы верасня «Юнімілк» стаў уласнікам ЗТАА «ВыСокавае» з Высокага, выкупіўшы ў нямецкай кампаніі Leahg Holding 100% у статутным капітале прадпрыемства.

Як паведамляе прэс-служба прадпрыемства, з другой паловы 2011 года пачнецца вытворчасць дзіцячых сокаў пад брэндамі «Цёма», Disney і «Смяшарыкі». Інвестыцыі ў рэканструкцыю прадпрыемства складуць каля 7 мільёнаў еўра. 100% выпусканай прадукцыі інвестар разлічвае пастаўляць на экспарт.

Актыўнасць «Юнімілка» пачалася пасля падпісанага пагаднення па зліцці малочнага бізнэсу ў Расіі і СНД з французскім канцэрнам Danone.

Французскі гігант даўно праяўляў цікавасць да Беларусі, але ў выніку вырашыў рэалізоўваць сваю стратэгію разам з «Юнімілкам». Таму СП у Беларусі дэ-факта перайшлі ў аператыўнае кіраванне аб'яднанай кампаніі.

**ЯВ, інф. tut.by**



**Рагулі і пастушкі — галоўны рэсурс Беларусі.**

### Сцісла

• **Расійская кампанія СУ-155 адмовілася ад будаўніцтва «Мінск-Сіці».** Маскоўскі забудоўшчык планаваў укласці ў будоўлю $720 млн — прапарцыйна сваёй 15%-ай долі. Мяркуецца, што СУ-155 выйшаў з праекта ў Мінску, бо мае дзяржкантракт — выступае субпадрадчыкам рэканструкцыі Вялікага тэатра ў Маскве, будуе жыллё для вайскоўцаў і пацярпелых ад лясных пажараў летам гэтага года.

• **Сідорскі прывязе з інвестыцыйнага форуму $2,7 мільярда?** Каля дваццаці інвестыцыйных дамоў было падпісана на Беларускім інвестыцыйным форуме ў Франкфурце-на-Майне. Сярод іх будаўніцтва новага лістапракатнага завода ў Жлобіне сумесна з італьянскай кампаніяй за 0,6—1 мільярд еўра і стварэнне яшчэ адной вытворчасці шкла ў Гомелі.

• **Францыя выпусціла манету 100 тысяч еўра.** На манеце знаходзіцца выява індыйскага маўзалея Тадж-Махал. Вага манеты складае кілаграм, яна зроблена з золата, а выява купала Тадж-Махала інкруставана 68 дыяментамі.

• **Сярэдні заробак — $432.** Па падліках Белстата, за месяц беларусы сталі зарабляць на 23 тысячы больш, чым у верасні. Да прадэклараванага сярэдняга заробку па краіне ў $500 не хапае амаль $70.

**ЯВ**

# «Мы павінны паведамляць пра ўсіх, хто фатаграфуе»

Пад'язджаю да вёскі Гліннае, што на ўсход ад Докшыц.

Вёска вялікая — насельніцтва пад паўтысячы чалавек. Пасярод Гліннага стаяць тры пустыя двухпавярхоўкі — колішнія саўгасныя дамы, даўно пакінутыя жыхарамі.

Каля двухпавярховак палае вогнішча. Вяскоўцы высякаюць хмызы і спальваюць на агні. Карцінка.

Падыходжу. Дастаю фотаапарат.

Стараюся выбраць найбольш удалыя ракурсы і здымаю людзей за працай.

Праз нейкі час мужчына кажа: «Хопіць табе тут здымаць».

Не рэагую. Потым ён кажа тое ж зноў.

Праз пару хвілін падышла да мяне жанчына. Як высветлілася потым — старшыня Бярэзінскага сельскага савета Валянціна Кургей. «Пакажыце дакументы!» Прад'яўляю пасведчанне сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў. «А што гэта за арганізацыя?» — запытвае чыноўніца. «Гэта карпаратыўная арганізацыя, якая аб'ядноўвае журналістаў». — «Гэта бээнэф? — не сунімаецца жанчына. — Пакажыце пасведчанне яшчэ раз, я не запомніла ваша прозвішча. Я мушу паведаміць пра вас у райвыканкам». «Навошта?» — здзіўляюся я. «Мы павінны паведамляць у райвыканкам пра ўсіх, хто фатаграфуе», — чую ў адказ.

Адмаўляюся другі раз паказваць пасведчанне і адыходжу. За спінай чую, як старшыня сельсавета кажа: «Яго сюды заслалі. Ён з бээнэф. Яму за гэта заплацілі». Чую, як хтосьці прапанаваў выклікаць міліцыю.

Іду далей па вясковай вуліцы. Мяне абганяе сельсавецкі «жыгулёнак». Хвіліны праз дзве вяртаецца. Побач з кіроўцам сядзіць участковы міліцыянт. «Жыгулёнак» спыняецца. Участковы просіць сесці ў машыну. Запытваецца, навошта я фатаграфую ў вёсцы ды просіць прад'явіць дакументы. Паглядзеў мой пашпарт і пасведчанне сябра БАЖа і выйшаў з машыны, каб патэлефанаваць у РАУС.

Запытваю тым часам у пільнага сельсаветчыка: «Навошта Вы выклікалі міліцыянта?» — «А чаму вы перад прэзідэнцкімі выбарамі разваліны фатаграфуеце? А раптам вы з бээнэф?» — кажа той. «А што калі б я нават быў і з БНФ? Гэта ж афіцыйна зарэгістраваная партыя», — запытваю.

Маўчаць.

Участковы вяртаецца і бярэцца перапісваць мае пашпартныя звесткі. Потым патрабуе, каб я выдаліў здымкі. Адмаўляюся выдаляць. Хвіліны дзве спрачаемся, і ўрэшце адпускае мяне.

Большая частка правінцыйных чыноўнікаў і простых грамадзянаў ніколі не сутыкаліся ні з якімі журналістамі, акрамя карэспандэнтаў «раёнкі». Не бачылі сябраў ніякіх партый і грамадскіх арганізацый, акрамя «Белай Русі» і БРСМа.

І таму заезджы дзівак, які фатаграфуе жыццё з непрывабных ракурсаў, збірае подпісы за незалежных кандыдатаў, распаўсюджвае недзяржаўныя газеты, адразу выклікае насцярожанасць.

Вораг? Займаецца «антыдзяржаўнай дзейнасцю»?

Вось такая атмасфера для «свабодных выбараў».

**Кастусь Шыталь, Докшыцы**



**Гэта не Афганістан. Гэта моцная і квітнеючая.**



**Знак памяці продкаў паставілі талакой.**

# На гераічным полі

## Актывісты з Баранавіч паставілі памятны знак у гонар 350–годдзя бітвы пад Палонкай.

Гэта была слаўная перамога беларускай зброі. У 1660 годзе войска Вялікага Княства Літоўскага перамагло там маскоўскіх захопнікаў. Гэта была пераломная бітва той доўгай вайны.

16 гадоў таму тутака ўпершыню паклалі валун і паставілі драўляную шыльду. Але, нямоцную, яе з часам зламалі невядомыя манкурты.

Грамадскасць не раз падымала пытанне аднаўлення шыльды, асабліва напярэдадні 350-х угодкаў Палонкаўскай бітвы, якія адзначаліся ў 2010 годзе. Баранавіцкі райвыканкам, аднак, «не знайшоў на гэта сродкаў».

Таму мясцовыя грамадскія актывісты на працягу года самастойна збіралі грошы і ўласнымі намаганнямі вырабілі на мармуровым камяні металічную шыльду.

Усталяванне знака суправаджалася і на гэты раз сваімі дзівосамі і здарэннямі. Спачатку прыбегла цяперашняя старшыня Палонкаўскага с/с Ніна Кісель, якая падняла страшэнны лямант і выклікала міліцыю, бо ўсталяванне, на яе думку, арганізавана без дазволу мясцовай улады.

Старшыня Баранавіцкай Рады Таварыства беларускай мовы Віктар Сырыца і краязнаўца Міхась Бернат патлумачылі маёру Вячаславу Таўкачову, што яны даслалі яшчэ раней змест шыльды ў Палонкаўскі сельсавет, што гэта не ўсталяванне новага знака, а аднаўленне старой шыльды, дазвол на якую дала мясцовая ўлада яшчэ ў 1994 годзе. Міліцыя паводзіла сябе вельмі спакойна, без гвалту і затрыманняў, карэктна і ўзважана выслухала абодва бакі. Урэшце аднаўлены памятны знак застаўся на гераічным Палонкаўскім полі. І прыемна тое, што баранавіцкія грамадскія актывісты і Палонкаўскі с\с дамовіліся аб сумеснай працы па добраўпарадкаванню месца Палонкаўскай бітвы 1660 года.

**Віктар Сырыца, Баранавічы**

# Калі аўтобус заязджае ў вокны

Рассоўваць ураніцы фіранкі і бачыць за два метры ад сябе грузавік ці аўтобус — малапрыемная перспектыва. Як і баяцца адчыніць вокны, каб не задыхнуцца ад выхлапных газаў перагружанай вуліцы. З такой бядой сутыкнуліся жыхары сталічных дамоў на вуліцы Маякоўскага.

### Памяркоўныя вайскоўцы

Маштабны рамонт дарогі з пашырэннем колькасці палос да чатырох у кожным кірунку пачаўся ў канцы 2008 года. Некалькі старых будынкаў стаялі блізка ад праезнай часткі — іх давялося пусціць пад знос, а жыхарам даць іншыя кватэры.

Цяпер, калі рамонтныя працы на Маякоўскага вядуцца найбольш актыўна, дарога нагадвае звілістую змейку. Машыны і аўтобусы вымушаныя скакаць то налева, то направа, часам прыціскаючыся ўшчыльную да дамоў.

Адлегласць між праезнай часткай і вокнамі часам не перавышае двух метраў. Паўметра з іх складае тратуар, па якім складана прайсці. Месцамі даводзіцца ступаць на праезную частку, абыходзячы слупы.

Працы павінны скончыцца за год-два, а пакуль жыхарам дома даводзіцца цярпець нязручнасці. Як яны змагаюцца з праблемай? Бабулька-фаталістка далёка за семдзесят, якая сядзела на лавачцы ў двары, толькі сурова падняла бровы: «У нас тут многа вайскоўцаў жыве. Начальства сказала, што так трэба. Значыцца, прывыкнем. Перажывём».

### Часовае — добра схаванае пастаяннае

Відаць, да аўтобусаў за два метры ад акна жыхарам прыйдзецца прывыкнуць. Адлегласць між двума дамамі, якія стаяць абапал дарогі, такая, што, апроч васьміпалоснай дарогі, улезуць хіба два тратуары метровай шырыні.

У «Гаррэмаўтадоры» згаджаюцца, што рэканструкцыя прынесла шмат нязручнасцяў: «Няма іншага выйсця, калі мы не хочам, каб праз некалькі гадоў мінскія вуліцы канчаткова спыніліся ў заторах. Прычым вы абавязкова адзначце, што нягледзячы на гіганцкія аб'ёмы працы, мы не перакрываем руху цалкам». Што датычна нарматываў, якія рэгулююць адлегласць паміж дарогай і домам, то тут парушэнняў няма: «Няўжо вы думаеце, што начальства зацвердзіла б праект з парушэннямі?»

### Будаўніцтва пад зямлёй і над зямлёй

Падобная праблема ўзнікла і ў іншай частцы горада, у мікраараёне Брылевічы.

Толькі тут дарога праходзіць ушчыльную ля будоўлі. Кампанія «Арэса-Сэрвіс» пачала ўзводзіць дом № 16 на скрыжаванні вуліцы Яна Чачота і праспекта Дзяржынскага. Вось толькі ў гэты час «Мінскметрабуд» вырашыў распачаць будаўніцтва станцыі «Малінаўка». Першай задачай стала пракладанне вуліцы-дублёра праспекта Дзяржынскага. Яна пройдзе ля самай «арэсаўскай» будоўлі. «Мы проста змесцім участак праспекта ў бок мікраараёна Брылевічы», — заявіў начальнік УП «Дырэкцыя па будаўніцтву Мінскага метрапалітэна» Павел Царун.

Вуліцу павінны дарабіць у бліжэйшыя тыдні, каб ужо 1 снежня па ёй мог паехаць транспарт. Каткі раўняюць асфальт, дарожнікі ўкладваюць бардзюры... А ў гэты час іншыя рабочыя працягваюць будоўлю за некалькі метраў, толькі вышэй. Непадалёк напагатове стаіць вежавы кран.

### «Бяспечная блізкасць вежавага крана»?

Ці не турбуе мінскіх чыноўнікаў небяспечнае суседства? Відаць, не. Але варта нагадаць, што паўгода таму на ўсялякі выпадак у сталіцы быў знішчаны прыпынак грамадскага транспарту, які знаходзіўся побач з будоўляй першага беларускага хмарачоса «Ветразь». У афіцыйнай фармулёўцы так і было напісана: «у сувязі з небяспечнай блізкасцю вежавага крана». У кампаніі «Арэса-Сэрвіс» пераконваюць, што небяспекі для дарожнага руху будоўля не прынясе.

Пакуль у сталіцы ідуць дзве «грамадска важныя» будоўлі, чубы паранейшаму трашчаць у звычайных мінчан. Пакуль адны не адчыняюць вокнаў, другія асцярожна праязджаюць і праходзяць уздоўж будоўлі, каб на іх нічога не звалілася зверху.

**Яўген Васількоў, фота аўтара**



**Спыніце ў наступным акне, калі ласка!**

# Краіна, дзе трыумфуе плоць

**Такой пабачыў Беларусь «Фатограф каралёў» Саша Гусаў.**

«Здаецца, Аляксандр Лукашэнка рыхтуецца да «зорнай» фотасесіі. Стала вядома, што найбліжэйшым часам з ім будзе працаваць вядомы на ўвесь свет фотамастак Саша Гусаў», — паведамляла «НН» год таму.

Казалі, што ідэя запрасіць гламурнага фатографа ў Беларусь належала тагачаснаму піяршчыку Лукашэнкі — лорду Бэлу.

**Саша Гусаў**
20 гадоў таму з'ехаў з Масквы ў Лондан і стаў адным з самых запатрабаваных фатографаў у свеце.

І вось фатограф паказаў вынікі сваёй працы.

— Дзялюся плёнам амаль двухгадовага знаходжання ў Беларусі. Толькі што выйшла мая новая кніга — Belarus Terra Incognita. «Шкада, што ні ў каго ў Расіі не знайшлося грошай замовіць мне што-небудзь падобнае!» — заявіў у сваім блогу на сайце часопіса «Сноб» Саша Гусаў.

На зайздрасць беларускім фатографам, Гусаву ніякіх перашкодаў падчас здымак не чынілі. Адзін з фотакораў, якія працавалі на парадзе на Дзень незалежнасці, расказаў «Салідарнасці»: «Гусаў працаваў з такім жа допускам, як і асабісты фатограф прэзідэнта, меў зносіны непасрэдна з прэс-сакратаром Лукашэнкі, на заўвагі і пярэчанні ахові зусім не рэагаваў».

Што ж атрымалі лукашэнкаўцы ў выніку? У альбоме няма ні гламуру, ні чыстых вуліц, ні працвітання.

Са здымкаў Сашы Гусава Беларусь паўстае краінай, дзе трыумфуюць сіла і плоць.

> «Шкада, што ў Расіі не знайшлося грошай замовіць мне што-небудзь падобнае!»

Беларусь у Гусава мілітарызаваная. Фатографа чаплялі бясконцыя фалічныя рулі гармат і аўтаматаў, ракеты на фоне жылых забудоў, камуфляж. Сам Лукашэнка фігуруе ў вайсковай форме на двух здымках з трох.

Фатограф зафіксаваў таксама дух масавых спартовых святаў — дзе рыфенштгалеўскае змяшалася з босхаўскім.

Эратызм і нават вульгарнасць — вось што выпінаецца ў Беларусі Гусава. Ён шмат здымаў дзікія пляжы. І рубенсаўскіх жанчын на іх — у бікіні на фоне барочных храмаў. Выпускніцы танцуюць канкан ля Вечнага агню на плошчы Перамогі, прадаўшчыца схіляецца ў дэкальтэ над акрываўленым свіным лычом у мясным аддзеле. Ікона стылю.

Камера ловіць і тонкае хараство — у кляштары, турме, і пажадлівую сэксуальнасць.

Здымкі фіксуюць многа варварства, безгустоўнасці — у звычках, манерах, забавах. Маладыя стаіць верхам на двух бронзавых конях, дзяўчына з пахабным манікюрам прыхіляецца да ўзброенага дэсантніка. Буйства жыцця.

Толькі Беларусь рэлігійная парушае прымат матэрыі над духам. Сярод фотаў многа здымкаў на рэлігійную тэматыку.

Але на фотах няма жабрацтва, бруду, безвыходнасці. Нават у жыцці інвалідаў фатограф шукае светліню.

Няма ў здымках і палітыкі. Магчыма, гэта быў адзіны — і своеасаблівы — рэверанс Гусава ў адрас прымаючага боку.

**Сяргей Мікулевіч**

















# У аўтакатастрофе загінуў прафесар Іван Нікітчанка

Транспартнае здарэнне адбылося ў пятніцу 19 лістапада прыкладна а 15-й гадзіне. Акадэмік Іван Нікітчанка ехаў на сваёй машыне «Фольксваген-Бора» па трасе Мінск—Маладзечна.

## Сутыкнуўся з ЗІЛам

Паводле інфармацыі, што дае Дзяржаўтаінспекцыя, Нікітчанка выехаў на сустрэчную паласу, дзе насустрач рухаўся ЗІЛ. Атрымалася лабавое сутыкненне. Грузавіком у момант сутыкнення кіраваў 47-гадовы мінчук. ЗІЛ належыць рамонтна-будаўнічаму трэсту, які ўваходзіць у сістэму Кіраўніцтва спраў прэзідэнта.

У бальніцу навукоўца даставілі праз сорак хвілін пасля здарэння. Доктар Юры Фёдараў з маладзечанскага шпіталя паведаміў «Нашай Ніве», што пацыент памёр а другой гадзіне ночы, не прыходзячы ў прытомнасць.

Траса Мінск—Маладзечна—Нарач лічыцца адной з найбольш небяспечных у Мінскай вобласці. На ёй адбываецца 35% транспартных здарэнняў са смяротным зыходам.

Здарэнне адбылося прыкладна за пяць кіламетраў ад мястэчка Краснае, на 56-м кіламетры аўтадарогі Мінск—Маладзечна. Туды Нікітчанка традыцыйна ездзіў на шынамантаж. З Краснага ён планаваў паехаць на лецішча, дзе і збіраўся правесці выходныя.

Што і казаць, гэты ўчастак трасы, сапраўды, вельмі неспрыяльны для кіроўцаў. Дарога там вузкая, з частымі паваротамі. Абмежаванні хуткасці нервуюць кіроўцаў. Часта здараецца, што кіроўцы не вытрымліваюць, ідуць на абгон.

## «Свядома заняў адраджэнскія пазіцыі»

У першай палове 1990-х гадоў Іван Нікітчанка ўваходзіў у склад ценявога кабінета апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце XII склікання. Як так выйшла, што ўраджэнец Браншчыны стаў на бок нацыянальнага руху? Згадвае былы старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка:

«Кожны сумленны чалавек, незалежна ад яго этнічнага паходжання, становіцца на бок праўды. Іван Мікалаевіч як чалавек глыбокі, мудры абсалютна свядома заняў нацыянальна-адраджэнскія пазіцыі. Ён уваходзіў у ценявы ўрад Пазняка. Браншчына — не чужы нам рэгіён, яшчэ болей мы парадніліся праз Чарнобыльскую трагедыю.

Нікітчанка няблага размаўляў пабеларуску. І з часам рабіў гэта ўсё лепей. Ён быў неад'емнай часткай беларускага руху».

«Нікітчанка быў чалавек, адданы навуцы, адданы нашай краіне. Невыпадкова, што ён прыйшоў у Фронт і быў у ценявым урадзе Фронту. Калі ён дзе быў асцярожны, то толькі таму, што меў вельмі кепскае здароўе, якое ён паклаў у чарнобыльскай зоне», — напісаў пра прафесара Зянон Пазняк.

## «Трэба ехаць — еду»

Галоўнай справай апошніх гадоў жыцця Івана Нікітчанкі было змаганне з наступствамі Чарнобыльскай катастрофы. Ён заўсёды з'яўляўся адным з арганізатараў «Чарнобыльскага шляху». Летась Мінюст нарэшце зарэгістраваў Цэнтр чарнобыльскіх ініцыятыў.

Сяржук Бахун працаваў разам з прафесарам Нікітчанкам у гэтым цэнтры. «Я прыйшоў да Нікітчанкі, калі зразумеў, што чарнобыльскай праблемай трэба актыўна займацца. Мы шмат падарожнічалі па Беларусі. Сустракаліся з людзьмі, у тым ліку ў «зоне». Нікітчанка не меў за звычку скардзіцца на сваё здароўе, што ў яго нешта баліць. У яго была не толькі вялізная энергія, але і вера. Сваёй верай ён запальваў іншых, пераконваў, што магчыма нешта змяніць. Іван Мікалаевіч быў вельмі разнастайным чалавекам. Ніколі не ганарыўся сваім званнем. Малавядомы факт, пра які Нікітчанка расказаў мне пры апошняй сустрэчы, — ён быў прафесійным хакеістам. Гуляў за маскоўскі «Спартак» цягам двух гадоў. Гуляў разам з вялікімі хакеістамі — Старшынавым, Маёравым. Шмат дзе пабываў, шмат каго ведаў», — кажа С.Бахун.

Акадэмік Нікітчанка лічыў, што ўлады хаваюць ад насельніцтва сапраўдныя наступствы трагедыі на


SVABODA.ORG (RFE/RL)

Чарнобыльскай АЭС. За тыдзень да гібелі ён даў сваю апошнюю прэсканферэнцыю. Актыўна выступаў супраць будаўніцтва АЭС.

## Развіталіся кандыдаты

На гэтых выбарах Іван Нікітчанка стаў даверанай асобай Віталя Рымашэўскага. Казаў, што толькі ў гэтага кандыдата ёсць праграма па ліквідацыі наступстваў Чарнобыля. Сустракаўся разам з кандыдатам з чарнобыльцамі ў Калінкавічах.

На пахаванні прысутнічала шмат вядомых людзей. Шматлікія кандыдаты ў прэзідэнты, палітыкі, акадэмікі.

Пахавалі Івана Нікітчанку 22 лістапада на Паўночных могілках.

**Зміцер Панкавец**

**Іван Нікітчанка**

нарадзіўся 10 студзеня 1939 у вёсцы Горыцы Бранскай вобласці (Расія). Вучоны ў галіне селекцыі жывёл. Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук (1986), доктар сельскагаспадарчых навук (1979), прафесар (1981). Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут (1960). З 1968 — навуковы супрацоўнік, загадчык сектара, кіраўнік селекцыйнага цэнтра Беларускага НДІ жывёлагадоўлі. З 1986 — намеснік старшыні Дзяржагрпрама БССР. З 1991 — генеральны дырэктар НДІ «Агранавука», з 1993 — віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага цэнтра стратэгічных даследаванняў. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1985—1990. Па ім засталося трое дзяцей і чацвёра ўнукаў.

## Спачуванні праз nn.by

Няхай Пан Бог прыме яго душу!

**Кастусь Жукоўскі**

Мае спачуванні сям'і спадара Івана. Выдатны навуковец, грамадзянін, чалавек. Яшчэ ў 2009-м быў у Мастах, праводзіў даследаванні мастачан на ўтрыманне ў арганізме малых дозаў радыяцыі. Светлая памяць гэтаму выбітнаму сыну Беларусі!

**Алесь Зарэмбюк**

Мае спачуванні родным і блізкім! Вечны адпачынак дай яму, Пане, а святло вечнае няхай яму свеціць!

**Руслан Равяка**

Вечная і светлая памяць сапраўднаму Грамадзяніну і Асобе!

**Алесь Лагвінец**

Вечная памяць! Страта проста непапраўная...

**Лявон Баршчэўскі**

Вялікая страта для Беларусі! Іван Мікалаевіч працаваў да апошняга дня. Мы абавязкова працягнем яго працу. Вечная памяць вялікаму Чалавеку!

**Сяржук Бахун**

Светлая памяць!

**Юрась Меляшкевіч**

Светлая памяць Івану Мікалаевічу. Працавалі разам у «Беларускай перспектыве». Быў сумленным і мудрым чалавекам.

**Аляксандр Фядута**

Вялікая страта для Беларусі. Выказваю спачуванні блізкім спадара Івана. Ён быў Беларусам «з вялікай літары». Няхай зямля яму будзе пухам!

**Артур Фінькевіч**

Спачуванні ўсім, хто жыццё гэтага Чалавека цаніў больш за яго смерць.

**Андрэй Мельнікаў**

Жахлівая навіна. У ліпені па справах службовых быў на лецішчы ў спадара Нікітчанкі. Ён запомніўся чалавекам надзвычай адукаваным, інтэлігентным і аптымістычным. Светлая памяць.

**Аляксей Мінчонак**

Светлая памяць светламу чалавеку.

**Антон Каліноўскі**

Трагедыя! Мае спачуванні родным і сваякам Івана Нікітчанкі! Разам з Вамі ў жалобным смутку зараз уся Беларусь! Ён столькі зрабіў для яе і колькі яшчэ змог бы зрабіць... На жаль.

**Алесь Таўстыка**

## Здарэнні сцісла

• **Трапіў у аварыю навагрудскі праваслаўны святар.** Мікалай Орса трапіў у здарэнне пад Баранавічамі. Паранены ён і ягоная жонка. Орса стаў вядомы ў выніку рэканструкцыі царквы ў Навагрудку — колішняй сядзібе беларуска-літоўскай мітраполіі. Святар рэалізаваў сваю задуму пасадзіць на гатычны храм маскоўскія цыбуліны.

• **Сэкс-туры ў Белавежскую пушчу спыненыя.** 27-гадоваму жыхару сталіцы інкрымінуецца арганізацыя на тэрыторыі Нацыянальнага парку сэкс-тураў для грамадзян Расіі. Сутэнёр «апякаў» два дзясяткі беларускіх прастытутак. Цяпер менеджару кахання пагражае ад сямі да дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

• **У Мінску затрымалі педафіла.** Пракуратура Цэнтральнага раёна Мінска распачала справу ў дачыненні да 44-гадовага мінчука. Нежанаты мужчына, які працуе рознарабочым, знаёміўся з падлеткамі, прапаноўваў ім выпіць, а затым здзяйсняў распусныя дзеянні. Дзеці былі ў асноўным з нешчаслівых сем'яў, лёгка ішлі на кантакт. Падазраваны пад вартай. Пакуль яму ставіцца ў віну адзін злачынны эпізод.

• **П'яны пагражаў падарваць дызель Маладзечна — Круляўшчызна.** У выніку дызель-цягнік затрымаўся 21 лістапада на 3 гадзіны 15 хвілін на станцыі Вілейка, эвакуявалі 80 пасажыраў. Псеўда-«тэрарыстам» аказаўся нецвярозы машыніст маторавагоннага дэпо — 41-гадовы жыхар Вілейкі. Яму пагражае пяць гадоў пазбаўлення волі.

• **Кіраўніцтва «Пінскдрэва» аб прычынах выбуху.** Камісія холдынга «Пінкдрэў» лічыць, што пажар і выбух адбыліся праз парушэнне рэгламенту рамонтных работ. «Абсталяванне на вытворчасці пелет да абеду таго трагічнага дня знаходзілася на прафілактыцы, і не былі завершаныя ўсе рэгламентаваныя работы. Без выканання паслядоўнасці было ўключана абсталяванне, што прывяло да выкіду рэчыва, якое складаецца з дробна размолатай драўнянай сыравіны, што пацягнула ўзгаранне і выбух», — гаворыцца ў заяве.

• **Як махляры рабуюць пенсіянераў.** У верасні 72-гадовы мінчанін, атрымаўшы на пошце пенсію, кіраваўся дамоў. Нечакана яго пераняў малады чалавек і сказаў, што знайшоў грошы. Яны адышлі ў суседні двор агледзець знаходку. З'явіўся яшчэ адзін незнаёмец, пачаў крычаць, што людзі бачылі, як былі знойдзены яго грошы. Пажылы чалавек запэўніваў, што пры сабе мае толькі пенсію. Мужчына папрасіў паказаць і, пакруціўшы грошы ў руках, вярнуў старому. Пасля пенсіянер разгледзеў, што трымае ў руках замест пенсіі толькі яе рэшткі. Нядаўна ля таго ж паштовага аддзялення пенсіянер убачыў таго самага чалавека. Пры затрыманні ў 31-гадовага мужчыны былі знойдзены падобны скруткі, прыгатаваны для наступнай ахвяры.

• **Перад візітам Лукашэнкі ў ПВТ знайшлі труп невядомага.** Цела знаходзілася на вуліцы Купрэвіча, на трэцім паверсе будоўлі. Прыкмет гвалтоўнай смерці пры аглядзе трупа не знойдзена. Мужчыну было 35—40 год. Прычыны ягонай смерці высвятляюцца.

**СМ**

# За Лукашэнку старшыні аблвыканкамаў і рэктары

Пасля рэгістрацыі былі надрукаваныя спісы davераных асобаў кандыдатаў. Было цікава, хто ўвойдзе ў кола абраных Аляксандрам Лукашэнкам. Спіс з трыццаці чалавек склаўся такі.

### Ні аўтамабіля, ні кватэры

Паводле афіцыйных звестак аб маёмасці кандыдатаў, прэтэндэнт Аляксандр Лукашэнка не мае ні жылля, ні машыны, ні каштоўных папер. Няўжо за 16 гадоў прэзідэнцтва нічога не зарабіў?

Найперш у яго ўвайшлі ўсе старшыні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Таксама спікеры абедзвюх палат парламента (Анатоль Рубінаў і Уладзімір Андрэйчанка). Натуральна, што ёсць і кіраўнік штаба Лукашэнкі, міністр адукацыі і па сумяшчальніцтве шэф «Белай Русі» Аляксандр Радзькоў.

Багата рэктараў універсітэтаў. Рэктар Гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкіх кааперацый Ала Навумчык, рэктар Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта Вітольд Песціс (адзін з заснавальнікаў «Белай Русі»), рэктар Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта Пятро Пойта, рэктар Магілёўскага ўніверсітэта харчавання Вячаслаў Шаршуноў.

Настаўнікі прадстаўлены дэпутатам — дырэктарам Лужаснянскай школы-інтэрната Уладзімірам Шыцько.

Ідэолагі — дэпутатам палаты прадстаўнікоў Марыяй Біруковай, якая раней выкладала на Гродзеншчыне.

Досыць шырокае прадстаўніцтва мае дырэктарскі корпус: генеральны дырэктар «Будтрэста №3» Мікалай Ашэйчык, генеральны дырэктар «Гомсельмаша» Валеры Жмайлік, генеральны дырэктар барысаўскага завода БАТЭ Анатоль Капскі, дырэктар Рэчыцкага метызнага завода Адам Вашкоў.

Два прадстаўнікі ўзорных сельскіх гаспадарак: Віктар Пінчук узначальвае агракамбінат «Усход» (Магілёўская вобласць), а Васіль Равяка — СПК «Прагрэс-Верцялішкі» (Гродзенская вобласць).

Умоўна можна лічыць, што дзеячаў культуры рэпрэзентуюць былы кіраўнік Купалаўскага тэатра Генадзь Давыдзька і пісьменнік Мікалай Чаргінец.

Спорт — кідальнік молата Вадзім Дзевятоўскі.

З медыцыны ёсць дырэктар Рэспубліканскага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак Алег Румо і загадчыца гінекалогіі Баранавіцкай бальніцы Ларыса Малікава.

Сярод даверaных асобаў толькі адзін бізнесмен — уладальнік брэсцкай фірмы «Санта-Брэмар» Аляксандр Машэнскі.

Ёсць і адна студэнтка — навучэнка гістафака Магілёўскага ўніверсітэта Надзея Шуткова.

**Зміцер Панкавец**

# Сезон тэлевыступаў адкрыты

**Першымі гонар з'явіцца на тэлеэкранах выпаў Віталю Рымашэўскаму і Алесю Міхалевічу.**

Да тых, хто пачынае, увага заўсёды найбольш пільная, а потым яна пачынае паціху рассейвацца.

Першае, што кінулася ў вочы пры выступе кандыдатаў, — гэта не самае зручнае іх размяшчэнне на экране, а таксама не самае ўдалае святло. Таксама, відаць, ім не растлумачылі, куды глядзець.

Затое гаварыў Рымашэўскі ўпэўнена і дзёрзка. Удала гуляў інтанацыямі. Даставаў розныя шыльдачкі, якія дэманстраваў гледачу.

Выступ амаль цалкам быў па-беларуску, апроч невялікай часткі адносна лёсу беларускай мовы.

«Абіралі прэзідэнта, а абралі цара, які турбуецца толькі пра сваіх сыноў і як набіць кішэні чыноўнікам», — адна з запамінальных фраз выступу.

Размова была пра вялізную карупцыю, пра рост цэнаў і маленькія заробкі, няякасную медыцыну, вялікую колькасць самазабойстваў і абортаў, слабую дапамогу маццяркам па доглядзе дзяцей.

Успомніў Віталь Рымашэўскі пра трагічную смерць ягонай даверанай асобы прафесара Івана Нікітчанкі. Ён запатрабаваў незалежнага расследавання гэтага здарэння.

Не прамінуў магчымасці кандыдат яшчэ раз нагадаць пра лёс зніклых палітыкаў. Пра палітвязня Мікалая Аўтуховіча.

Потым ён дастаў партрэт Гітлера са Сталінам і нагадаў пра лёс дыктатараў. Са словамі «Хопіць дыктатуры!» ён разарваў гэты плакат.

Некалькі разоў Рымашэўскі вельмі ўдала параўноўваў Беларусь з Германіяй. Чаму беларускія пенсіянеры, напрыклад, не могуць падарожнічаць па свеце, як нямецкія. Цікавай была ідэя адлічэння на карысць пенсійнага фонду 20% акцый буйных беларускіх прадпрыемстваў.

Паабяцаў хадэк высокія заробкі для вайсковых афіцэраў. Абяцаў ураўнаць іх з заробкамі ў спецслужбах.

Алесь Міхалевіч хваляваўся болей. Складвалася ўражанне, што без зазірання ў шпаргалку ён не мог успомніць нават сваю біяграфію. Нярэдка папраўляў акуляры, запінаўся. Уменню трымацца перад відэакамерамі яму яшчэ трэба вучыцца.

Выступаў па-расейску, апроч дзвюх невялікіх частак. Міхалевіч адразу папярэдзіў, што нічога абяцаць не хоча. «Я не хачу ўдзельнічаць у спаборніцтве абяцанняў кандыдатаў», — зазначыў А.Міхалевіч. Але на 19-й хвіліне прагучала: я абяцаю...

Сваю прамову ён будаваў па прынцыпе «пытанне — адказ». Пытанні зачытваліся з ноўтбука.

Адно пытанне тычылася Мытнага саюза з Расіяй. Міхалевіч прапанаваў шукаць у ім «менш ідэалогіі, а больш эканомікі». «Калі гэта будзе эфектыўным, то варта застацца», — сказаў А.Міхалевіч.

«Армія патрэбная. Я за тое, каб Беларусь была нейтральнай дзяржавай. Але нейтральная не значыць пацыфісцкая. Сумесныя вучэнні патрэбныя і з НАТА, і з Расіяй. Афіцэры пасля выхаду ў запас павінны атрымаць дом пад Мінскам ці ў іншым месцы», — гэта што датычыць арміі.

Алесь Міхалевіч перакананы, што змяншаць колькасць міліцыі не трэба, бо «пасля эканамічных пераўтварэнняў непазбежны рост злачыннасці».

«Я не абяцаю павышэння пенсіі», — сказаў ён. На ягоную думку, і сённяшняе павышэнне адаб'ецца ростам цэнаў і павышэннем курсу даляра.

«Хроснага бацьку» глядзеў. Не ўразіла», — пракаментаваў ён скандальны фільм НТВ.

Рэакцыю ў інтэрнэце лічыць вызначальнай не даводзіцца, але выступ Рымашэўскага выклікаў непараўнальна больш станоўчых рэакцый за Міхалевічаў.

**Зміцер Панкавец**

### «Журналісты на БТ зашуганыя»

Віталь Рымашэўскі сваім выступам застаўся задаволены: «Ад візіту на БТ засталіся збольшага пазітыўныя ўражанні, адно што журналісты там нейкія зашуганыя. Перад пачаткам эфіру да мяне падышла намесніца кіраўніка БТ і прапанавала падпісаць нейкія паперы аб адказнасці за змест маёй прамовы. Я адмовіўся ў рэзкай форме. Яшчэ не задаволіла тое, што каманда, каторая мяне здымала, не была падрыхтаваная. Адмовіліся асвятленне змяніць, калі мы іх папрасілі. Аднак у цэлым не сказаў бы, што пачуваўся дыскамфортна. Сваім выступам задаволены».

**Алесь Пілецкі**

### «Трэба, каб каманда рабіла кандыдату макіяж»

«Жывы эфір — гэта жорсткая рэч, і ён сапраўды распранае чалавека, — кажа палітычны аналітык Аляксандр Класкоўскі. — Трэба мець вялікі досвед, каб трымацца ў кадры. Мне так падалося, што і з грымам і са святлом кепска папрацавалі ў абодвух выпадках [Рымашэўскага і Міхалевіча]. І эксперты пра гэта папярэджвалі: не трэба думаць, што кандыдатам хтосьці будзе дапамагаць. Таму трэба, відаць, рыхтавацца камандай да такіх выступаў. Нават аж да таго, каб нехта з каманды вазіў з сабой пудру і рабіў адпаведны макіяж перад эфірам. Будзем спадзявацца, што наступныя кандыдаты пра гэта паклапоцяцца».

**Запісала Наста Шамрэй**

### «Міхалевіч размаўляў з працадаўцамі, а не з гледачамі»

«Міхалевіч выступаў так, нібыта прыйшоў уладкоўвацца на нейкую працу, — кажа журналіст Віктар Малішэўскі. — Яму патрэбна пакінуць пра сябе ўражанне як пра разумнага чалавека, які можа адказаць на любыя пытанні. Ён так і адказваў, на гэтай складанай мове на складаныя пытанні працадаўцы. І нават спрабаваў сыходзіць ад адказаў. Напрыклад, пытанне, ці глядзеў ён «Хроснага бацьку». Любы чалавек, які чуе такое пытанне, чакае, што вось цяпер яму нешта пра фільм скажуць. А Міхалевіч сказаў: «Глядзеў, але не ўражаны», — гэта быў адказ на пытанне».

**Запісала НШ**

### «Замест Міхалевіча можна было пасадзіць кібарга з выявай Міхалевіча»

«Рымашэўскі глядзеўся цікавей за Міхалевіча, — лічыць палітолаг Уладзімір Падгол. — Ён быў шчыры, гаварыў ад усяго сэрца. А замест Міхалевіча можна было пасадзіць кібарга нейкага з выявай Міхалевіча, каб ён усё гэта агучыў. Быў бы той самы эфект. Эмоцыяў няма, сэрца, душу не кранае. Адзінае, чаго ён дасягнуў, — выбаршчыкі пераканаліся, што гэты кандыдат — не чорт з рагамі і не тэрарыст. Але маё меркаванне: ніводнага выбаршчыка сваім выступам ён не сагітаваў».

**Запісала НШ**

## Сцісла

• **Лукашэнка праігнараваў радыёэфір.** Замест гэтага была працягнута перадача «Раніца з Беларускім радыё», у межах якой з 6.49 да 6.54 з прамовай аб падтрымцы цяперашняга курсу выступіў пісьменнік Мікалай Мятліцкі. На мінулых выбарах Лукашэнка таксама адмаўляўся ад часу, што належыць кандыдату. Навошта, калі пра яго і так гавораць усе дзяржаўныя СМІ?

• **Някляеву не дазволілі ў радыёзвароце выкарыстоўваць свае песні.** Матывіроўкай адмовы было тое, што ўсе кандыдаты павінны быць у роўных умовах. Нічога, Някляеў сам праспяваў хіты кшталту «Сёння ў нашай хаце свята».

• **Міліцыя: Масавыя акцыі на Плошчы былі забаронены і ў 2006-м.** Як паведаміў намеснік міністра ўнутраных справаў Яўген Полудзень, калі ж усё-такі хто-небудзь з кандыдатаў будзе ўдзельнічаць у несанкцыянаваных акцыях, міліцыя будзе паведамляць пра гэта ў Цэнтрвыбаркам.

**СМ, ЗП**




**Кандыдаты ад апазіцыі маюць рэдкую магчымасць звяртацца да людзей. На фота: Рыгор Кастусёў.**

# Рэгістрацыя як шоу

Рэгістрацыя кандыдатаў нечым нагадвала ток-шоу. Вядучыя (сябры ЦВК) і ўдзельнікі (кандыдаты) практыкаваліся ў дасціпнасці. У наступны раўнд прайшлі ўсе.

У Палац Рэспублікі пускалі з галоўнага ўваходу. Служба аховы прэзідэнта дзейнічала досыць карэктна. Што Лукашэнкі не будзе, можна было меркаваць хоць з таго, што на мерапрыемства вольна акрэдытавалі ўсіх фота- і відэажурналістаў.

### Кастусёў з Радзьковым па-беларуску

У зале №7 гэтыя прагнозы збыліся. Шыльда на стале з імем Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі адсутнічала. Замест яго прысутнічаць меўся міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. Яго месца было побач з Рыгорам Кастусёвым і Алесем Міхалевічам.

Першым з кандыдатаў з'явіўся Андрэй Саннікаў з кіраўніком свайго передвыбарчага блока Уладзімірам Кобецам. Потым і астатнія прэтэндэнты сталі займаць свае месцы.

Павел Севярынец прадстаўляў інтарэсы Віталя Рымашэўскага (кандыдат ад хадэкаў знаходзіўся ў той дзень у Парыжы). На столік побач з сабой ён паставіў бел-чырвонабелы сцяжок.

Рыгор Кастусёў адразу паціснуў руку Радзькову. Пачалі паміж сабой нешта ажыўлена абмяркоўваць.

Потым папытаўся ў Кастусёва, пра што гаварылі. «Ну, ужо неадназова сутыкаліся паміж сабой, успаміналі нашы папярэднія сустрэчы. Размаўлялі па-беларуску», — сказаў прадстаўнік Партыі БНФ.

Нясмела руку Радзькову паціснуў і Міхалевіч. Гэта трапіла на фота і было ахарактарызавана некаторымі як з'яўленне новай «канструктыўнай апазіцыі».

На сталах былі расстаўленыя пляшкі з беларускай мінералкай і квасным напоем. Шчыра сказаць, не самыя дарагія пачастункі.

### «Астап Бэндэр адпачывае»

Апошнім з кандыдатаў з'явіўся Мікалай Статкевіч. Амаль адразу Лідзія Ярмошына і пачала пасяджэнне ЦВК. Найперш невялікі экскурс у мінулыя этапы кампаніі зрабіў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. Казаў, што ўсё было дэмакратычна. А вось подпісы амаль усе збіралі з парушэннямі. Апроч каго б вы падумалі? Правільна, Аляксандра Лукашэнкі. У зале пачуўся смяшок.




Ярмошынай Раманчук падарыў кнігу пра Парыж.

Не мінуў магчымасці Лазавік паіранізаваць з Мікалая Статкевіча. «Самыя лепшыя зборшчыкі подпісаў былі ў Мікалая Статкевіча. Яны маглі ўгаварыць паставіць подпісы нават памерлых. Толькі ў Віцебску 20 нябожчыкаў распісалася за Статкевіча». Скарыстаўшыся гэтым фактам, Лазавік абсмяяў Статкевічавы заявы пра ціск і рэпрэсіі: «Збіраючы подпісы сярод прывідаў, каманда Статкевіча сутыкалася з прывіднымі перашкодамі».

Зрэшты, вырашылі, што 100 тысяч сабралі дзесяць кандыдатаў. А вось тут і пачался цікавае. Сталі абмяркоўваць, ці рэгістраваць Уладзіміра Правальскага.

Паводле звестак ЦВК, гэты кандыдат назбіраў аж... 118 подпісаў!

Сам Правальскі назваў працу выбарчай камісіі Першамайскага раёна Віцебска перавышэннем службовых паўнамоцтваў. І патрабаваў звестак па праверцы подпісаў.

«Парушаеце парадак працы, сп.Правальскі», — сказала Ярмошына. «А вы парушылі выбарчы кодэкс», — парыраваў кандыдатнебарака.

Заслухаўшы Правальскага да канца, Ярмошына ад усёй душы прамовіла: «Астап Бэндэр адпачывае». Віцебскага прадпрымальніка не зарэгістравалі. «Можаце быць свабодным», — сказала старшыня ЦВК.

### Міхалевіч зрабіў камплімент аб дэмакратычнасці

У алфавітным парадку першым зарэгістраваны быў Рыгор Кастусёў. Кандыдат ад БНФ у сваёй прамове сканцэнтраваўся на тым, што ў апазіцыйных кандыдатаў параненйшаму няма доступу да СМІ. А многія незалежныя выданні выкінутыя з сетак распаўсюду.

Наступным быў Лукашэнка. І тут пярэчанняў ні ў каго не ўзнікла. Аляксандр Радзькоў выступіў хутка. Найперш падзякаваў тым, хто збіраў за дзейснага кіраўніка подпісы і тым, хто распісаўся.

Жонка Міхалевіча памылілася ў дэкларацыі на 900 тысяч рублёў. Дробязь, вырашылі сябры камісіі. Ёсць трэці кандыдат.

Міхалевіч прамаўляў па-расійску. Зрабіў камплімент гэтым выбарам, што ўсё праходзіць дэмакратычна, у чым «заслуга і ЦВК». У кіраўніка яго ініцыятыўнай групы Юрася Меляшкевіча ў гэты дзень нарадзілася дачка. «Дзеці — гэта тое, што нас аб'ядноўвае незалежна ад палітычных поглядаў», — скончыў А.Міхалевіч.

Самыя вялікія пытанні па рэгістрацыі былі з Уладзімірам Някляевым. Высветлілася, што ў дэкларацыю ён не падаў 20 акцый «Прыёрбанка». У прынцыпе, гэтага дастаткова, каб кандыдата зняць з дыстанцыі, але не ў нашых сённяшніх умовах.

Някляеву ўсё прабачылі. Нават Ярмошына і Лазавік на гэтым настойвалі, бо самы ж актыўны кандыдат. Прадстаўнік Някляева Васіль Лявонаў пераканаваны, што налета ў Беларусі будзе новы прэзідэнт.

### Раманчук падкалоў Ярмошыну

Яраслаў Раманчук выйшаў за пасведчаннем кандыдата з кнігай пра Парыж. «Гэта здзек з мяне ці спачуванне?» — запыталася невыязная Ярмошына. «Гэта гаворыць пра тое, калі мы станем дэмакратычнымі, то ў Парыжы змогуць пабываць усе, нават Вы», — адказаў ліберальны эканаміст.

Выходзячы на трыбуну, Севярынец кіўнуў: «Зараз будзе». Так і было. «Сістэма сённяшняй улады прагніла, і яе трэба мяняць. Сённяшнія ўлады павінны пакаяцца, што падманваюць народ. Аляксандр Лукашэнка не можа балатавацца на пасаду прэзідэнта», — казаў з трыбуны П.Севярынец.

Ён нагадаў пра хрысціянскія каштоўнасці, а прамову скончыў словамі «Жыве Беларусь». Гэта выклікала невялікія апладысменты.

### «Передайце гаспадару вашага балагана»

Прамова Саннікава была найлепш падрыхтаванай. «Нашу краіну называюць апошняй дыктатурай. Гэта ганьба для краіны. Але гэта справядліва».

Саннікаў згадаў пра зніклых палітыкаў. Ён прапанаваў ушанаваць Віктара Ганчара хвілінай маўчання. «Беларусы не хочуць жыць пры дыктатуры. У нас ёсць шанец гэта змяніць. Я зраблю ўсё, каб зрабіць Беларусь дэмакратычнай», — зазначыў ён.

Мікола Статкевіч уцягнуўся ў дыскусію з Лазавіком, адказваючы на яго ныя закіды. «Перадайце гаспадару вашага балагана, што я клоўнам у гэтым балагане не буду», — як і Кастусёў з Севярынцам, Статкевіч прамаўляў па-беларуску. Блогерам выступ Статкевіча спадабаўся.

Голас Цярэшчанкі быў вельмі манатонны. А ў Дзмітрыя Уса ў дэкларацыі не хапала аж 4,5 мільёна. Тым не менш, гэта менш за 20% прыбытку. Зарэгістравалі і яго.

### Пачаў Рымашэўскі

Пасля гэтага Ярмошына агучыла, што дэбаты будуць праходзіць толькі ў жывым эфіры. Пайшлі на саступку апазіцыйным кандыдатам, якія настойвалі на гэтым. А вось выступы па ТБ могуць як у жывым эфіры, так і ў запісе. Вырашаць самім кандыдатам.

Лёсаванне эфірнага часу адбывалася так, што кандыдат цягнуў канверт з парадкавым нумарам. Гонар першым з'явіцца на экранах выпаў Віталю Рымашэўскаму.

На вуліцы кандыдатаў віталі іх каманды. На інтэрнэт-сувязі з Кастрычніцкай плошчай быў Уладзімір Някляеў. Ён у той момант знаходзіўся ў польскім МЗС. Саннікаў нават трохі паразмаўляў з сябрам-канкурэнтам.

Яшчэ адзін этап пройдзены. Пачынаецца месяц агітацыі.

**Зміцер Панкавец**

## Ярмошына адпомсціла Севярынцу за непаціснутую руку?

Старшыня ЦВК падпісала дакументы на друк улётак для перадвыбарчай агітацыі за Віталя Рымашэўскага ў пятніцу 19 лістапада ў 15.35, праз пяць хвілін, як у Мінску з безнаяўнымі грашыма перасталі працаваць банкі. Прадстаўнік Рымашэўскага з дамовай чакаў у прыёмнай Ярмошынай тры гадзіны, паведамляе прэсавая служба БХД. Запусціць працэс вырабу ўлётак каманда Рымашэўскага змагла толькі ў панядзелак.

18 лістапада, падчас уручэння кандыдацкіх пасведчанняў у ЦВК, прадстаўнік Рымашэўскага Павал Севярынец адмовіўся паціснуць руку Лідзіі Ярмошынай.

**СМ**

## Прыбыткі Лукашэнкі — найбольшыя. Саннікаў і Цярэшчанка не маюць нічога

Адразу пасля рэгістрацыі кандыдатаў сталі вядомыя даходы, якія яны задэклaравалі для ЦВК. Лукашэнка — лідар у гэтай намінацыі.

Дзейны прэзідэнт атрымаў летась 90 мільёнаў рублёў (7,5 мільёна штомесяц). На мінулых выбарах даход Лукашэнкі складаў 59 мільёнаў.

На другім месцы нечакана апынуўся Алесь Міхалевіч з 75 мільёнамі. У Дзмітрыя Уса — 34 мільёны, ва Уладзіміра Някляева — 22, у Віталя Рымашэўскага — 14, у Мікалая Статкевіча — 8, у эканаміста Яраслава Раманчука — менш за 7.

Рыгор Кастусёў летась зарабіў 200 тысяч расійскіх рублёў (прыкладна 20 мільёнаў). Справа ў тым, што кандыдат ад БНФ працуе ў санкт-пецярбургскай будаўнічай фірме.

Самае цікавае, што ў Андрэя Саннікава і Віктара Цярэшчанкі летась не было ніякага даходу.

**ЗП**

## Адкуль грошы, Алесь?

Сярод апанентаў Аляксандра Лукашэнкі на выбарах-2010 найбольшыя прыбыткі задэклараваў Алесь Міхалевіч.

Мы пацікавіліся ў кандыдата, адкуль у яго такія прыбыткі.

Частку іх складаюць грошы ад прададзенай паловы дома ў Мар'інай Горцы, што належала палітыку. Частка — паступленні ад здачы ў арэнду кватэры ў Мінску. І рэшта прыбыткаў — Алесевы заробкі.

Кім працуе Міхалевіч? У афіцыйнай біяграфіі значыцца, што ў 2008 — 2010 гг. ён з'яўляўся юрыстам Беларускага незалежнага прафсаюза, а з 2010 г. — дырэктар Агенцтва перакладаў і юрыдычных паслуг.

**Сямён Печанко**

## Аўтуховіч і Мілінкевіч сталі даверанымі асобамі Кастусёва

У кандыдата ад Партыі БНф пакуль 24 дaвераныя асобы з 30 магчымых.

«Уключэннем Мікалая Аўтуховіча ў склад даверaных асобаў я хацеў засведчыць салідарнасць з усімі палітвязнямі», — зазначыў Р.Кастусёў.

Таксама ў спісе даверaных асобаў Рыгора Кастусёва — лідар Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, яго дарадца Алесь Лагвінец, старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, лідар слонімскай суполкі Партыі БНФ Іван Шэга, лідар моладзевай арганізацыі «Правы Альянс» Юрый Карэтнікаў, лідар прадпрымальніцкага руху ў Баранавічах Мікалай Чарнавус ды інш.

**ЗП**

# «Не адолеюць вас ні імперыялісты, ні камуністы»

**26 лістапада Уладзіміру Караткевічу споўнілася б 80 гадоў. Найлепшых творцаў мы называем Народнымі — тытулам, які перарос пачатковы савецкі зместт. Але для Караткевіча, які іранізаваў з узнагародаў, гэтыя шаты падаюцца занадта фармалізаванымі. Яму больш пасуе азначэнне Улюбёнага пісьменніка беларускай літаратуры. Тым больш што слова «ўлюбёны», як і «прыўкрасны», трапіла ў мову з яго лёгкай рукі. Гэтыя ўспаміны Анатоля Забалоцкага дазваляюць нам зірнуць на Караткевіча позіркам староннягa, дадаюць рысачкі, беларусу незаўважныя. Яны ахопліваюць 1960—1970-я гады, у якія пісаліся ключавыя творы. Перад намі — Караткевіч у росквіце творчых сілаў.**



**Уладзімір Караткевіч у 1960-я.**

Дзесяць гадоў я працаваў на «Беларусьфільме», шмат далёкіх куткоў Беларусі пабачыў дзякуючы Караткевічу.

Як весела было з ім ездзіць, колькі ж у розных застоллях загінула яго ўпушчаных жартаў, расказаных выпадкаў — ніхто не запісваў.

...Неяк мы дапазна заседзеліся ў мяне. Валодзя нават у позні час заўсёды збіраўся дадому: «Мама турбуецца». Доўга мы чакалі транспарт. Раптам пад'ехаў «Ікарус» здвоены, з «гармонікам» — у два салоны. Валодзя стаяў, апусціўшы галаву, а ўбачыўшы аўтобус, прамовіў з уздыхам: «Ой, адзінокая гармонь прыехала, дзякуй Богу» — і заскочыў усярэдзіну.

Спецыялізаваўся ён пасля заканчэння Кіеўскага ўніверсітэта на славянскіх мовах, меў рэдкую памятлівасць, у паездках біў ведамі ў любой сферы чалавечага быцця; усякую траву мог назваць па лаціне і па-народнаму і аб карысці і месцах росту распавесці. Які ж ён быў патрыёт сваёй зямлі і мовы!

### Мутнае вока

...Караткевіч ніколі не чапаў накрухмаленых сурвэтак, горкі якіх стаяць у рэстаранах, асабліва маляўніча — у «Белавежскай пушчы». На пытанне, чаму, адказваў: «Не начальства ж іх мые, а старая — за капейкі. Абыдземся», — і за шмат гадоў ні разу не адступіў ад свайго правіла.

Яршысты, нязручны чалавек, Караткевіч ганіцеляў меў нямала, быў шчыры, ні ў чым не дыпламатнічаў. У былым архірэйскім падворку адкрылі Дом мастацтваў. Валодзя адзін з першых ахрысціў яго — «Мутнае вока», таму распарадчык не пускаў яго ў залу, а назва ў тыя гады так і замацавалася за ўстановай.

### Фільм збяёдалі

...У яго вуснах слова «Бацькаўшчына» гучала неяк асабліва спеўна. Мурашкі па спіне, бывала, прабягалі, калі пачынаў ён аб мінулым Белай Русі казаць. Ад яго я пачуў упершыню і беларускую прыказку: «Бяда толькі рака красіць», якую ён ставіў эпіграфам да гісторыі беларускага народа.

Шукшын, прачытаўшы сцэнар Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», лаяў усіх і мяне, што па такім матэрыяле фільм збяёдалі. А пасля лістоў Караткевіча чакаў небессэнсоўнага знаёмства. Але праз свецкую мітусню не сустрэліся Уладзімір з Васілём.

...Чытаю апублікаваныя лісты Караткевіча да Гераніма Стулпана. Яго тэмперамент і стыль ні з чым не зблытаеш: «Слухай, чорт! Калі будзеш і далей невядома з якой прычыны злавацца і не адкажаш нават на гэты, трэці, ліст, я таксама крыху раззлуюся. Пішы, чуеш? І калі злуеш, проста і шчыра скажы пра гэта. Я пастараюся заслужыць дараванне». У гэтым пасажы гучыць жывы Караткевіч.

### Воля кагорты

...Гады, аддадзеныя «Беларусьфільму», падарылі мне сустрэчы з многімі майстрамі слова рэспублікі; сярод іх былі Янка Брыль, Андрэй Макаёнак, Іван Мележ, Пятро Глебка, Аркадзь Куляшоў, Васіль Быкаў. Але найбліжэйшыя і найтрывалейшыя былі зносіны з Уладзімірам Караткевічам. З ім мы, назіраючы, абмяркоўвалі ўвесь працэс выцяснення літаратараў з кінатворчасці. Пры гэтым кінарэдактура спасылалася на нібы асаблівую спецыфіку «кінадраматургіі». Паўсядзённую працу кінастудыі ўзначальвала згуртаванае «кагорта-ядро» рэдактараў, кінарэжысёраў і эканамістаў (дырэктараў, якія загадваюць рэальнымі грашыма і працоўнай сілай). Ядро было збітае задоўга да Айчыннай вайны. Узначальваў яго да самага скону Корш-Саблін: усюды быў яго подпіс, але ўсе рашэнні на самай справе рыхтаваў склад: І.Шульман, А.Кучар, М.Фрайман, І.Дорскі, С.Рабінаў, С.Вайнерт...

Калі нават на нейкі час кіраўніцтва рэспублікі прызначала галоўным рэдактарам Івана Шамякіна, Андрэя Макаёнка або Максіма Лужаніна, усё роўна воля «кагорты» выконвалася непарушна. Існавала шматступенная цэнзура. Зняты матэрыял «перажоўваў» на студыі, а ў Маскве датопчуць па лісце-заключэнні, напісаным амаль заўсёды М.Фрайманам. Ідэалагічны страх у Беларусі быў горшы за маскоўскі.

У перыяд «адлігі» ў кіёску Рускага музея ў Ленінградзе я накупляў значкоў з лозунгамі кастрычніка 1917 — «Мір народам», «Зямля сялянам»; пра «Заводы рабочым» не было значкоў. Максім Лужанін, з якім я сустрэўся ў студыі, прачытаўшы на лацкане майго пінжака пра зямлю, моўчкі ўцёк.

### ...а замест гэтага напіўся

...Неяк прыехаўшы ў аэрапорт, мы пачулі аб'яву па радыё аб хуткім вылеце ў Вільню і наяўнасці білетаў. Валодзя загарэўся: «Ляцім». ...У Вільні ён вызваніў Бронюса Марцінкявічуса. Прыехалі і іншыя браты прыбалтыйскія. Вершы, апавяданні, творчыя планы — застолле доўжылася мірна. Потым пачалося смешнае: суразмоўцы зараўлі, калі перайшлі да дзяльбы межаў. Літоўцы патрабавалі ў Караткевіча возера Нерыс (Нарач). Латыш патрабаваў зямлю ў Даўгаўпілса. Мастак патрабаваў у Караткевіча Браслаўшчыну ...Раніцай Караткевіч будзіў нас гучным жартам: «Хацеў дайсці да Даўгаўпілса, а замест гэтага напіўся. А я ж ім учора ўсё аддаваў — не бяруць... Спяць...».

### Радасць і гнеў

...У Рагачове чакалі аўтобуса на аўтастанцыі. Вецер пранізлівы. Паўгадзіны няма аўтобуса, і людзей няма, акрамя нас. І вось з'явілася бабуля з вялікім чамаданам у суправаджэнні дзяўчынкі і хлопчыка, абодва дашкольнага ўзросту. Бабуля агледзелася, прымасціла чамадан на дошкі і звярнулася да Караткевіча, гледзячы знізу на яго, высокага, закінуўшы галаву да неба: «Хлопчык, пасцеражы дзетак і куфар. Я ў краму збегаю па ліманад».

Валодзя, загасіўшы папяросу, прысеў на кукішкі перад напружана-прыціхлымі дзеткамі: «Шкада, цукерак няма, але будуць. Як цябе звацць?»— спытаў ён хлопчыка. Ён маўчыць, старэйшая дзяўчынка таксама маўчыць і строга пазірае на брата. Валодзя смяецца, паўтарае пытанне. Хлопчык доўга маўчаў і ўсё-такі не стрываў: «Нам не кажуць, мы і не ведаем». Валодзя ўскочыў з воклічам: «Во малайцы! Во малайцы! Не адолеюць вас ні імперыялісты, ні камуністы».

У аўтобусе ён абмяркоўваў з бабуляй яе радавод, дзеткі гатовыя былі пайсці да яго ў госці, але бабуля не змяніла сваіх планаў (прадукты даставіць і ўнукаў).

...Здымаем дакументальны нарыс «Сведкі вечнасці». Караткевіч, як у сваім агародзе, арыентаваўся на зямлі Беларусі: знаходзіў дуб Міцкевіча ў ваколіцах Наваградка або таполю Напалеона на Нёмане. Мы, удзельнікі здымак, начавалі ў Рагачове і ў яго дзядзькі І. В. Грынкевіча. Ён ветліва карміў нас свежазлоўленай у Дняпры рыбай. Рыба дый паветра ў сталоўцы струменілі пах мазуты. «Ды гэтага нельга есці», — абураліся кіношнікі. Ігар Васільевіч, просячы прабачэння, прапаноўваў гародніну. Уладзімір Сямёнавіч моўчкі і дэманстратыўна еў рыбу, а калі «дзядзька» выйшаў, гнеўным шэптам адчытаў: «Ну, што ён вінаваты, што Днепр запаганены «нафтай». Не сыпце соль яму на раны. Пашкадуйце сівую галаву. Ешце радыску, шчаўе. Знялі б лепш пра гэтую бяду сюжэт. Ды ні ў кога духу не хопіць! А тут не вякайце...»

...У самыя безнадзейныя перыяды маёй працы на «Беларусьфільме» Уладзімір Сямёнавіч ратаваў мяне ад бязвер'я і адчаю. Дзякую яму за спавядальныя разважанні і ўчынкі. Пры згадцы пра яго ўва мне ажываюць Светліня і Надзея, ім пасеяныя.

**Анатоль Забалоцкі**

нар. у 1935. Кінааператар. Працаваў на «Беларусьфільме», «Талінфільме», «Масфільме». Пастаноўшчык фільмаў «Альпійская балада», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Каліна красная», «Печкі-лавачкі». Жыве ў Маскве.

Друкуецца скарочана паводле «Наш современник»

# Жыццё і ліра Уладзіміра Дудзіцкага

Пра гэтага чалавека можна стварыць прыгодніцкі раман. Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Да пэўнага часу Уладзіміра Дудзіцкага не лічылі сапраўдным паэтам нават у эміграцкім асяроддзі. Ат, піша нешта чалавек, час ад часу друкуецца ў перыёдыках, але на кніжку так і не выб'ецца...

А за сваё жыццё Уладзімір Дудзіцкі склаў некалькі зборнікаў вершаў.

Першы з іх, «Песні і думы», у лютым 1933-га апынуўся ў нетрах ГПУ і там, мусіць, быў спалены.

Другі, «Напярэймы жаданням», складзены на пачатку 1940-х, раскідала ваенная віхура. У 1948 годзе ў лісце да Юркі Віцьбіча паэт паведамляў, што падрыхтаваў да друку зборнікі «Хвалі» і «Да блізкіх і далёкіх», а ў 1953 пісаў пра зборнік «Журботныя струны». І ў вайну, і па вайне склаў Уладзімір Дудзіцкі таксама два зборнікі апавяданняў. І яны не выйшлі ў свет.

Наогул, жыццё Уладзіміра Дудзіцкага само па сабе надаецца на раман. Сын сялянкі, вядомае ў пухавіцкіх ваколіцах пявунні, якую ў вайну забілі савецкія партызаны, зямляк народнага сакратара БНР Тодара Вернікоўскага, вязень мінскай «амерыканкі» і сталінскіх лагераў, брат вязняў і выгнанцаў, арганізатар беларускага школьніцтва і культурніцкай працы ў Мінску падчас нямецкай акупацыі, адзін час супрацоўнік генерала Андрэя Уласава, паспяховы жыхар Венесуэлы ў паваенны час, дырэктар беларускай службы радыёстанцыі «Вызваленне» (пазней радыё «Свабода»), выкладчык Блумінгтонскага ўніверсітэта (штат Індыяна, ЗША), элегантны мужчына, лавелас, мнагажэнец, піток («мог выпіць цэбар гарэлкі», і не заўсёды тое можна было заўважыць), ён аднаго разу бясследна знік. Адны казалі, што настальгія пагнала яго ў СССР, а Яніна Каханоўская, пляменніца Антона Луцкевіча і Данчыкава бабка, лічыла, што паэт з'ехаў у Аргенціну, дзе было шмат прасавецкіх эмігрантаў, там напіўся і нецвярозы быў вывезены ў СССР. З іншага боку, Лявон Юрэвіч, даследчык жыцця і творчасці Уладзіміра Дудзіцкага, уважае, што той кінуў жонку і дзяцей «дзеля мо чарговага кахання і чарговай краіны».

Каб напісаць раман пра гэтага цікавага і таленавітага чалавека, патрабуецца таленавіты празаік. А што Уладзімір Дудзіцкі быў таленавіты чалавек і пісьменнік — такое адкрыццё ягоныя супрацоўнікі зрабілі ў 1994 годзе, калі Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку выдаў укладзены Лявонам Юрэвічам том ягонай творчай спадчыны «Напярэймы жаданням». Уладзімір Дудзіцкі, які «быў згублены і як чалавек, і як паэт» (доктар Вітаўт Кіпель), нарадзіўся як пісьменнік. «Як з паасобных цаглінак складаецца дом, так з паасобных вершаў, забытых публікацыяў вырас Паэт» (доктар Янка Запруднік).

Калі да каго і стасуецца вядомае «напісанае застаецца» і «рукапісы не гараць», дык у немалой ступені да Уладзіміра Дудзіцкага. Лявон Юрэвіч, выдаўшы ягоны пасмяротны том, не спыніў пошукаў і ўжо ў 1997 годзе у «Архіўнай кнізе» (Нью-Ёрк, 1997) змясціў шэраг паэтычных і празаічных твораў пісьменніка.

**Вязень мінскай «амерыканкі», паспяховы жыхар Венесуэлы ў паваенны час, дырэктар радыё «Свабода», лавелас, мнагажэнец, піток («мог выпіць цэбар гарэлкі»), ён аднаго разу бясследна знік. Магчыма, быў выкрадзены і вывезены ў СССР.**

У 1990-я імя Уладзіміра Дудзіцкага вярнулася і на Бацькаўшчыну. У анталогіі эміграцкай паэзіі «Туга па Радзіме» (1992) і зборніку «А часу больш, чым вечнасць: Літаратура беларускага замежжа» (1995) Барыс Сачанка апублікаваў 26 ягоных вершаў і ўрывак з паэмы «Маіх уяў ружовых ранкі». Вершы паэта Міхась Скобла змясціў у анталогіі беларускай паэзіі XX стагоддзя «Краса і сіла» (2003). Усяго разам у гэтых выданнях надрукавана 28 вершатвораў. Празаічныя творы Уладзіміра Дудзіцкага былі надрукаваныя ў зборніку эміграцыйнай гістарычнай прозы «Эквівалент» і ў кнізе беларускіх мемуараў на эміграцыі, якія выйшлі ў 2005 годзе ў «Бібліятэцы Бацькаўшчыны».

Цяпер можна канстатаваць, што доўг чалавеку, які любіў і песціў у сваім сэрцы Беларусь, сплочаны. На гэтым тыдні ў серыі «Галасы Айчыны», якую сёлета распачало выдавецтва «Лімарыус», выйшла кніга Уладзіміра Дудзіцкага «Творы».

Вядома, можна было б панаракаць на складальніка гэтага зборніка Лявона Юрэвіча і на выдаўцоў за тое, што па-за кнігаю засталіся лісты пісьменніка, але перш за ўсё трэба адзначыць, што ў ёй творчая спадчына пісьменніка прадстаўлена найбольш поўна. Калі ў бінімаўскім зборніку «Напярэймы жаданням» змешчана 175 паэтычных твораў, дык у «Творах» мы можам прачытаць ужо 206 вершатвораў Уладзіміра Дудзіцкага. Істотнае папаўненне. На пяць твораў павялічыўся раздзел прозы. Таксама істотнае папаўненне, бо ў бінімаўскім выданні іх было толькі пяць. Што ж тычыцца паэтычных перакладаў, дык іх па-ранейшаму засталося шэсць.




**Дудзіцкі У. Творы.** / Укладанне, прадмова і бібліяграфічны каментрый Л. Юрэвіча. — Мінск: Лімарыус, 2010.

Пішучы пра новую кнігу, у якой маюцца таксама аўтабіяграфічны нарыс Уладзіміра Дудзіцкага і бібліяграфічны каментар да ягоных твораў, нельга не адзначыць, што Лявон Юрэвіч напісаў таксама і прадмову да яе. Не памятаю, калі я, чытаючы прадмову да нейкае кнігі, смяяўся б. Чытаючы ж гэты тэкст Лявона Юрэвіча, я не мог устрымацца ад смеху. Аўтар, па-мойму, здолеў паказаць і зацікавіць чытача неардынарнай асобай — амурнікам, пітком, у нейкай меры авантурнікам і разам з тым таленавітым чалавекам і пісьменнікам.

## Расійскі кінакрытык: «Масакра» — карціна забаўная, але перагружаная

Дырэктар праграм Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю, прафесар Кірыл Разлогаў лічыць беларускую стужку цікавай.

— «Масакра» — карціна забаўная, зробленая, безумоўна, таленавітымі людзьмі ў рэчышчы досыць характэрнай разнавіднасці жанру фільмаў жахаў, якія ў Беларусі былі прадстаўлены карцінай Валерыя Рубінчыка «Дзікае паляванне караля Стаха», — адзначыў расійскі прафесар. — А яшчэ раней, у 1920-х, фільмам Канстанціна Эгерта «Мядзведжае вяселле» па сцэнары Анатоля Луначарскага. У «Масакры» цікавыя акцёрскія працы, вынаходлівая рэжысура. Хоць, безумоўна, карціна перагружана і не ўва ўсім дацягнута да таго, на што яна магла б прэтэндаваць.

Але ўсё адно, гэта цікавае сведчанне таго, што беларускае кіно жыве і працягвае развівацца ў тым ліку і ў неартадаксальных кірунках. У фільме даволі шмат унутраных алюзій, якія, напэўна, за межамі Беларусі не чытаюцца. І якія, можа быць, для экспарту варта падкрэсліць. Саламяная архітэктура Артура Клінава вельмі добрая. Наогул, выяўленчае рашэнне ў фільме цікавае, жывапісныя працы таксама. Яны ствараюць дух такога напаўаматарскага дылетантызму, які ў дадзеным выпадку наўмысны, я думаю. Таму што калі б гэта было зроблена ў акадэмічным духу, гэта было б значна менш цікава.

Фільм беларускага рэжысёра «Масакра» выйшаў сёлета. А на шырокім экране з'явіўся на мінулым тыдні.

**Кастусь Матушыч**

### Сцісла

• **Новы альбом «J: морс» бясплатна.** Група «J: морс» выклала для вольнага запампоўвання свой новы альбом «Электрычнасць». У альбом увайшлі 11 песень. Канцэртная прэзентацыя дыска адбудзецца 11 снежня ў мінскім Палацы спорту.

• **Полацкі езуіцкі калегіум ушанавалі бронзавай скульптурай.** 17 лістапада ў Міжнародны дзень студэнтаў у Полацку адкрылі помнік сярэднявечнаму шкаляру. Скульптуру вышынёй амаль два метры ўсталявалі каля будынка былога кадэцкага корпуса, дзе цяпер месціцца факультэт інфармацыйных тэхналогій Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Помнікам Полацкі ўніверсітэт ушаноўвае памяць пра Полацкі езуіцкі калегіум — першую на тэрыторыі Беларусі вышэйшую навучальную ўстанову. Яе заснаваў у 1581 годзе кароль Сцяпан Батура.

• **Вершаваная гісторыя Беларусі.** Кнігу «Шлях. Твары, думкі, галасы. Рыфмаваная гісторыя ў адценнях беларускага духу» прэзентавалі 18 лістапада на сядзібе ТБМ у Мінску. Яе напісаў кандыдат гістарычных навук Сяргей Кавалёў — ураджэнец Віцебска. Ён працаваў выкладчыкам у Тэхналагічным універсітэце, але за свае дэмакратычныя погляды быў звольнены. Сем гадоў таму аўтар памёр у дзень свайго 50-годдзя. Кніга выйшла ў выдавецтве «Кнігазбор» на сродкі сваякоў аўтара. Прадмову да яе напісаў Уладзімір Арлоў.

• **«Олівер Твіст» па-беларуску.** У выдавецтве «Галіяфы» выйшаў раман Чарльза Дыкенса «Олівер Твіст». Выданне ўжо з'явілася на паліцах кнігарні «Галіяфы» (крама «Падземка», пр-т Незалежнасці, 43). Пераклад Яўгена Бяласіна, рэдактар — Святлана Богуш, мастак — Анатоль Тадорскі.

**СМ**





17 лістапада ў Мінску прайшла камерная сустрэча з паэтам Славамірам Адамовічам — першая па яго вяртанні на Радзіму. Ён распавёў, як не пісалася добрых вершаў у Нарвегіі і як з дапамогай новых тэхналогіяў ён жыў і дыхаў «беларускім жыццём». Цяпер Адамовіч рыхтуе новую кнігу вершаў — «Рым».

## СЛАВАМІР АДАМОВІЧ

### ЭМІГРАНТ

*Землякам у замежжы*

Дзень да вечара перабыў,
ноч да раніцы пераспаў,
а не ўсе яшчэ крыўды збыў,
не ўсяго сябе распластаў.
Вырваць кратны свой боль з душы
не, не здолееш, як ні рві
на чужым, на злым скавышы
хоць крыжуй сябе, хоць гняві.
Будзеш спаць хоць гадзіны тры,
а ўсё роўна прысніцца дом,
і зялёныя чараты,
і над пушчаю летні гром.
Дзе ж ты дзенешся ад свайго,
дзе прыстроіш свой вольны спеў?
На чужыне? О не, крый бо!..
На радзіму цябе сарве.
Каса–дама зірне ў білет,
ухмыльнецца абурана: «Як?
Наш утульны ватэрклазет
зноў мяняеце на бардак?»
...У салоне вас толькі сем,
плюс газеты: «СБ», «Звязда»,
і па радыё рускі эфэм:
«С возвращением, эмигрант!»

# Смак пяску на зубах

**Алесь Кіркевіч.** Эсэ.

Сапраўдныя археолагі заўжды болей нагадвалі паэтаў і авантурыстаў, чым паважных навукоўцаў. Генрыха Шлімана адразу «папёрлі б» як з мінскага Інстытута гісторыі, так і з кафедры археалогіі Оксфарда. Хаця б таму, што нельга надзяваць на сваю жонку ўпрыгожанні Алены Траянскай, папярэдне не зафіксаваўшы месца, дзе яны былі знойдзеныя.

Шліман у адказ на нашы папрокі хутчэй за ўсё плюнуў бы і паехаў шукаць якое-небудзь чарговае эльдарада, вывучыўшы па дарозе яшчэ пару «мёртвых» моваў.

Палітыкаў-археолагаў можна вылучыць у асобны тып: Пазняк, Ткачоў, Чарнавол ды той жа Томас Эдвард Лоўрэнс — ён жа Лоўрэнс Аравійскі. Яны яскрава адрозніваюцца ад палітыкаў бюракратычна-чэкісцкага складу кшталту Пуціна-Мядзведзева. Ну адразу ж відаць: замест сімвала партыі — які-небудзь вершнік з глыбіняў стагоддзяў, замест праграмы — вершы, замест біяграфіі — спіс перакапаных гарадзішчаў... Электарат усяго гэтага, вядома, не зразумее, але адчуе прысутнасць таямніцы, схаванай праўды, якая, быццам закапаны ў полі скарб, свеціцца з-пад зямлі цёмнай восеньскай ноччу. І пачуцця тут, як і ва ўсіх народных песнях, нашмат больш, чым зместу.

Праграма ж чэкісцка-бюракратычнага «блока», як правіла, выверaная і вылізаная да апошняй кропкі. Усё ў іх проста і напісана быццам на «нармальнам рускам языке», але нешта ўсё адно не дае спакою. Афіцыёзнасць заўжды стварае нейкі эфект мянтоўскага пратакола — падпішы і пойдзеш дахаты. 70% падпішуць любы пратакол, 30% задумаюцца — гэта нармальны адсотак лахоў і казакоў у любым грамадстве, халопаў і служылай шляхты ў нашай колішняй дзяржаве.

І не трэба нічому здзіўляцца. Вось каб той жа Кастусёў, прадстаўнік партыі, карані якой губляюцца ў глыбінях масавых пахаванняў сталінскай эпохі, захацеў займець 80% на выбарах, яму трэба было б адразу «абкласціся» бюракратыяй:



усе дарадцы мусяць важыць не менш за 110 кг, касцюмы ад Dolce... На кожным пікеце я прапанаваў бы ставіць як мінімум чатыры чалавекі: старшыня пікета, намеснік старшыні, сакратарка (+ прыбіральшчыца на паўставачкі), грузчык і вартаўнік у адной асобе (стол і тры крэслы — абавязкова!). У такім кандыдаце людзі адчулі б уладу, драпежную і любячую руку, якая стабільна абкрадала іх дзядоў, бацькоў, сватоў, мужоў, сыноў і дачок. І забудзьце вы нарэшце пра гэтыя сумныя Курапаты, павіншуйце лепш народ з 23 лютым ці старым новым годам!

...Археолагі — цудоўныя душэўныя людзі, якія складаюць вершы падчас раскопак, жартуюць са студэнтамі (наконт дэкана), але ў той жа час «без грузу» могуць разбурыць ці недакапаць і кінуць які-небудзь археалагічны помнік. Непрафесіяналы падымуць лямант, а майстры шуфля і нівеліра пераглянуцца і паціснуць плячыма: «Ну што яны разумеюць? Галоўнае — гэта смак пяску на зубах, згарэлая спіна, парывы ветру над Нёманам у спякотны ліпеньскі поўдзень. А бітай керамікі і крэмню ў нас і так поўныя падвалы...» Галоўнае — працэс, а не здабыча — ці ж гэта не філасофія тургенеўскага паляўнічага? Ці ж не ў гэтым своеасаблівы археалагічны дзэн?

Наша памяць заблукала недзе паміж напаўабрынутымі скляпеннямі падземных хадоў, якія ёсць у кожным горадзе, але ніхто дакладна не скажа, дзе. Яна чакае нас на найбліжэйшым узгорку, на вясковым каменным могільніку, пад выкручанай яблыняй на закінутай сядзібе. Каб мы яе не знайшлі, цёмныя сілы (у выглядзе чэкісцка-бюракратычнай закулісы) ствараюць усялякія перашкоды: артэфакты крадуць, раскопы засыпаюць, археолагаў спойваюць... Урэшце пачынаецца зіма, калі капаць немагчыма. Але яна дачакаецца. Бо вясна ўсё адно прыйдзе.

*Гродна*

## Пакуль вярстаўся нумар

**Ізноў артыкул 193-1**

18 лістапада Гродзенская пракуратура папярэдзіла маладафронтаўца Алеся Кіркевіча за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі (арт. 193–1 КК).

Нагодай стала заява маці 16–гадовага сябра арганізацыі Тамаша Прыхода. «Да яе на працу прыйшлі супрацоўнікі КДБ. Вынікам стала заява жанчыны пра тое, што мы нібыта ўцягваем яе сына ў незаконную дзейнасць», — расказаў Алесь Кіркевіч. Па яго словах, яму прапанавалі падпісаць абавязацельства спыніць дзейнасць ад імя «Маладога фронту». А.Кіркевіч паперу не падпісаў.

Арт. 193–1 з'явіўся ў Крымінальным кодэксе ў 2005 годзе, незадоўга да прэзідэнцкіх выбараў. Паводле гэтага артыкула асуджана 17 чалавек.

**Сямён Печанко**

# Вечнасць ды іншыя часы

**Павал Касцюкевіч.** Апавяданне.

*Вользе Такарчук*

Бярнардзе Бярнардаўне Дзямянчык сніцца кіраўнік савецкай Беларусі Пётр Машэраў і вельмі просіць прынесці яму на магілу кропу.

«Аднаго пука хопіць», — разважае кабета пасля надзвычайнага сну, лежачы на пасцелі. Аднак ейны дзень мінае ў клопатах і турботах, ніякім чынам не звязаных з выкананнем просьбы сасьнёнага нябожчыка. На наступную ноч такі самы чалавечны і беларускі, як пры жыцці, Машэраў зноў прыходзіць у кабецін сон і просіць тое самае: «Пук кропу—магіла—мне».

Кабета наважваецца схадзіць, але цягне з сабою для смеласці супрацоўніцу. Не тое што цягне, але так выходзіць, што пасля другой «машэраўскай» ночы, не ў змозе маўчаць, яна распавяла пра сон першай-лепшай паўзнаёмай жанчыне, якая таксама прыйшла на работу рана — на выходных забылася перавесці гадзіннік. Дагэтуль яны разам, крыху прыспаныя, нудзіліся па розных кутах пустой аграмаднай канторы. Як выявілася, бабка той жанчыны была вядзьмарка, і таму яна змалку не баіцца «ўсяго такога».

Заўтрашнім світанкам — каб паспець да працы — дзве кабеты прыязджаюць на станцыю метро «Барысаўскі тракт» і скіроўваюцца ў бок Маскоўскіх кладоў. Мінаюць могілкавую браму, у якую ўбудаваны пост міліцыі. На посце малады міліцыянер уважліва праводзіць кабет вачыма. Нешта падазрона. Але што? Можа, шостая гадзіна, а якой заявіліся на могілкі наведніцы? Ці ссохлая лістота, што так весела адгукаецца пад нагамі ў гэтай невялічкай дэлегацыі жывых людзей, якія дужа спяшаюцца адведаць абсалютна нежывых, моцна сціснуўшы пры гэтым у руцэ букет кропу? Прадаюць яны яго там ці што...

Над галавой у міліцыянера на манер німба ўзносіцца новая, са стромым пад'ёмам фуражка. Хаця Бярнардзе Бярнардаўне масіўны авал шапкі разам з залатымі кантамі і кукардай на чырвоным акольшы больш нагадвае штучны вянок з кутасікамі, што афіцыйныя асобы гэтак любяць ускладаць да афіцыйных помнікаў. Мінаючы міліцыянера, яна нават недалікатна рассмяялася.

Сцежкамі нябыту, пагоставымі алеямі, міліцыянер пакрысе пускаецца ў лёгкую пагоню. Але ж міліцыянеру —хай сабе маладому —цяжка ўпаляваць дзвюх кабет. Асабліва калі ты ўдаеш, што не даганяеш, а проста імкліва крочыш па сваіх справах, пакуль самі кабеты лятуць з усяе моцы, даюць шчырага дзерака. А яшчэ асабліва, калі нечакана пахіснулася твая ўласная ідэалагічная ўстойлівасць — табе раптам зрабілася няўцям, чаму без дай прычыны ты мусіш даганяць людзей, а яны — уцякаць. І калі ў даважак на скрыжаванні №23 дзве ўцякачкі зусім разбягаюцца ад цябе па розных дарожках.

Урэшце малады міліцыянер, які напачатку жыва ўяўляў, як правасуддзе з лёгкасцю насцігне ўсмешлівых спекулянтак на чужым горы, цяпер запавольвае хаду, бо, ушчэнт неэфектыўна даганяючы супрацоўніцу Бярнарды Бярнардаўны, фактычна страціў абедзвюх кабет.

У гэтым зацішным мінскім мікрараёне малады міліцыянт губляе фуражку на брацкай магіле экіпажа «Як-40», ахвяраў страшнай авіякатастрофы 1979 г. Прычына падзення фуражкі — міліцыянт імкліва адхіснуўся назад, згледзеўшы, што ўсе пяць бюстаў на помніку —два лётчыкі і тры сцюардэсы — на адзін твар.

Падымаючы фуражку, што на якія секунды ператварылася ў вянок афіцыйнай асобы, міліцыянт узважвае: «Што, тыя двое хлопцаў паступілі разам у лётніцкае, а потым пацягнулі ў прафесію сваіх трох сясцёр-блізнючак? Ці, можа, бюсты з фотаздымкаў ляпіў мастак з Сярэдняй Азіі, для якога ўсе еўрапейцы — аднакія з твару? І ці, наогул, магчымае нараджэнне пяці блізнят?»

Не, папросту помнікі загінуламу экіпажу рабілі на казённыя грошы. Не ведаючы гэтай акалічнасці, міліцыянт стаіць збіты з панталыку і маладой пыхі. У одуме садзіцца проста на халодную зямлю ля аэрафлотаўскай магілы, раптам пасталелы і рашуча негатовы да далейшае пагоні.

Тым жа часам, адбягаючыся далей ад капцоў партыйных дзеячаў і вядомых музыкаў, мінаючы праваслаўных і габрэяў, у зацішнай каталіцкай секцыі на адным з помнікаў Бярнарда Бярнардаўна прыкмячае імя свайго палюбоўніка, з якім яна разышлася і адразу ж згубіла з вока шмат гадоў назад. Каханак, што быў уцешны ў любошчах і нерашучы ў знаках увагі, памёр, як высвятляецца, такой самай залатой восенню пятнаццаць гадоў таму — на які тыдзень раней за сёньняшнюю дату. Палюбоўнік хаваў, што мае дзяцей. Pamięć od żony, syna, córki. А яна ж здагадвалася, не, нават выразна ведала, і таму крыху крыўдавала, хоць і сама не казала яму пра мужа. У любым разе, менавіта гэтак яна і ўяўляла ягоную сям'ю: дачка і сын. І жонка.

З непадораным Машэраву кропам стала перад надтруннем.

А на макаўцы суседняга помніка, ля магутнае таполі, сядзіць надзіва жоўты птах. З футровай грудкаю, гуллівы і рухавы. Прыгўдала так тупае лапкай, да самазабыцця нешта спявае, і яго сакаўная, колеру манга шыйка хапатліва торгаецца ў няспынным танцы. Нарэшце прыйшла.

# Мядзведзь скінуў нашыйнік Пуціна

### Расія пацяшаецца: мо і Мядзведзеў скіне следам?

Белы мядзведзь, на якога прэм'ер Уладзімір Пуцін вясной гэтага года надзеў спадарожнікавы нашыйнік, пазбавіўся ад прыбора, і навукоўцы былі вымушаныя спыніць назіранне за яго рухамі.

Паведамленне аб гэтым з'явілася яшчэ 19 кастрычніка на сайце прэм'ера, а роўна праз месяц гэтую навіну заўважылі СМІ, у прыватнасці, сайт «Весці».

Урадавы сайт, што абавязаны сачыць за падапечным прэм'ера, паведаміў, што спадарожнікавы нашыйнік скінуты яшчэ ў канцы жніўня 2010 года. Спадарожнікавы нашыйнік працягвае падаваць сігналы. Гэта дазваляе навукоўцам адсочваць перамяшчэнне вельмі рухомых у гэты час года арктычных ільдоў. Навукоўцы з Інстытута праблем экалогіі і эвалюцыі лічаць, што страта нашыйніка — «цалкам натуральная сітуацыя, звязаная з ростам арктычнага звера».

Уладзімір Пуцін надзеў нашыйнік на шыю мядзведзю падчас візіту на зямлю Франца-Ёсіфа ў красавіку 2010 года. А ўжо ў ліпені Міністэрства прыродных рэсурсаў і экалогіі прыняло стратэгію захавання белых мядзведзяў. Пад асабістым кантролем кіраўніка ўрада знаходзіўся не толькі мядзведзь, але таксама бялуха Даша і амурскі тыгр Серга. Уладзімір Пуцін браў удзел у навуковых экспедыцыях па вывучэнні гэтых жывёл і кожны раз сам уздзяваў на звера прыбор, які дазваляе адсочваць яго перамяшчэнне.

Навіна аб вызваленні мядзведзя, дзякуючы некаторым пацешным сугуччам, знайшла водгук у інтэрнэце. У прыватнасці, выданне Polit.ru публікуе карыкатуру Ёлкіна.

На ёй намаляваны персанаж, падобны да іншага ўдзельніка кіраўнічага тандэма, на ім таксама надзеты ашыйнік з надпісам «Пуцін». На сваім маніторы гэты персанаж чытае навіну аб белым мядзведзі і запытвае: «Можа, і мне ўдасца?»

**Мікола Бугай,**
**інф. newsru.com**




# Візітоўка Лукашэнкі

### Праўда, гэта наўрад ці назавеш візітоўкай у простым сэнсе слова.

Хутчэй гэта картка, якая апынаецца ў руках чалавека, які атрымаў кветкі, падарунак або нейкае пасланне ад Аляксандра Рыгоравіча. Яна паказвае на знак увагі з боку кіраўніка дзяржавы.

Візітоўка простая. На белай рэльефнай паперы з ціснёным гербам.

Картка, аднабаковая. Ні нумара тэлефона, ні e-mail, ні, зразумела, таго, пад якім імем можна знайсці, да прыкладу, у Skype.




Выканана яна па-руску.

Тым не менш, двое вядомых нам людзей, якія маюць такія візітоўкі, з імі практычна не расстаюцца. Для гэтых картак у іх партманэ выдзеленыя асобныя кішэнькі.

**«Салідарнасць»**

# Маскоўскія мільянеры беларускага паходжання разбудоўваюць родныя вёскі

### Нават адселеныя пасля Чарнобыля.

Беларускія праваслаўныя парталы расказалі, што ў вёсцы Бычыха Гарадоцкага раёна нейкая расейская бізнэсвумэн будуе храм.

Прозвішча дабрадзейкі, якая ўзгадала пра малую радзіму, не называецца, але ніякай таямніцы тут няма. Храм будуе жалезная лэдзі расійскага рынку сувязі Анастасія Асіціс.

Падчас «дзікай прыватызацыі» пачатку 1990-х яна таямнічым чынам здолела вывесці з-пад кантролю Маскоўскай гарадской тэлефоннай сеткі (МГТС), супрацоўнікам якой была доўгі час, два каштоўныя актывы — сеткі «Алтай» і «Іскра». На аснове гэтых сетак былі створаны новы аператар АСВТ, яны ж былі выкарыстаныя падчас фармавання тэхналагічнай інфраструктуры кампаніі МТС у 1993—1994. Сп-ня Асіціс адразу атрымала кантроль над 24% акцый найбуйнейшай сотавай сеткі і стала першым генеральным дырэктарам МТС.

Цікава, што ў яе роднай вёсцы храма ніколі не было. Ён будуецца на месцы, дзе калісьці стаяў дом бабулі Анастасіі Асіціс. Вось такі капрыз.

Прычым гэта толькі адзін з праектаў будаўніцтва цэркваў, якія ў сваіх родных вёсках будуюць цяпер багатыя масквічы. Напрыклад, наш чалавек з Рублёўкі, уладальнік эліт-клуба «Ніколіна гара» Сяргей Караткевіч будуе храм у вёсцы Жалезнікі Веткаўскага раёна. Цікава, што вёска гэтая наогул была адселеная пасля Чарнобыльскай аварыі.

А потым расійскія мецэнаты (братоў Караткевічаў двое) вырашылі, што радыяцыя — гэта не страшна. Яны тут пабудавалі сабе дом, дамы для гасцей, царкву. Ці ведаюць госці з Рублёўкі, што іх прывозяць адпачываць у радыяцыйную зону, не магу сказаць.

У вёсцы Звянчатка Клімавіцкага раёна на асабістыя сродкі пабудаваў і ўладкоўвае храм былы нам. начальніка ГУУС Масквы, генерал міліцыі Васіль Чэмісаў.

**Святлана Калінкіна,**
**skalinkina.livejournal.com**

# 22 гады пад арыштам

### Жыццё дзеля свабоды — доля Аўн Сан Су Чжы.

Вызваленне з турмы лідаркі Нацыянальнай лігі за дэмакратыю М'янмы Аўн Сан Чжы называюць шанцам на перамены ў гэтай краіне — якую часта называюць азіяцкім аналагам Беларусі. На паперы там стабільнасць, эканамічны рост, а на справе краіна скацілася ў лік найбяднейшых.

М'янма, або на ангельскі манер Бірма, — адна з самых старажытных дзяржаваў Паўднёва-Усходняй Азіі. Найбольшага росквіту культура краіны дасягнула ў IX—XIII стагоддзях, калі сталіцай быў горад Паган. З таго часу М'янму называюць «краінай залатых пагадаў».

Бірма была незалежнай, пакуль у XIX стагоддзі не прыйшлі англічане. Каланізатары ўключылі краіну ў склад брытанскай Індыі. Горды бірманскі народ апынуўся пад двайным прыгнётам: англічан і мігрантаў з Індыі. Апошнія былі мусульманамі і, займаючы кіроўныя пасады, пагарджалі будысцкімі традыцыямі мясцовага люду.

Паміж сусветнымі войнамі ўзнікае нацыяналістычны рух танкінаў. Маладыя бірманцы падкрэслівалі, што яны, а не чужынцы, гаспадары ў краіне. Лідарам танкінаў быў студэнт Рангунскага ўніверсітэта Аўн Сан. Ён паходзіў з роду бірманскіх князёўм'іноджы. Яго продак Шве Ян — «залаты» Ян — загінуў, змагаючыся з англічанамі. Сваякі лічылі Аўн Сана рэінкарнацыяй залатога Яна.

Сярод танкінаў таксама вылучаліся У Тан — будучы генсек ААН (ён наведваў Беларусь у савецкі час), Не Він, пазней першы кіраўнік вайсковай хунты.

Кіруючыся прынцыпам Пілсудскага («цяжкасці метраполіі — шанец для калоніі»), Аўн Сан з пачаткам Другой сусветнай вайны пераязджае ў Японію. Як незалежнікі Усходняй Еўропы імкнуліся выкарыстаць Гітлера для вызвалення з-пад Сталіна, так і азіяцкія незалежніцкія рухі будучых М'янмы, В'етнама, Інданезіі гатовыя былі абаперціся на японцаў у барацьбе супраць каланізатараў.

У Японіі была створаная Армія незалежнасці Бірмы. У снежні 1941 пры падтрымцы бірманцаў японцы ўвайшлі ў краіну залатых пагадаў.

Японія прызнала бірманскую незалежнасць, і калі брытанцы вярнуліся, бірманцы ўжо не хацелі з ёй развітвацца. 19 ліпеня 1947 Аўн Сан і яго найбліжэйшыя паплечнікі былі забітыя. І хоць сувязь забойцаў з англічанамі не даказалі, многае на тое паказвала.

Усё ж каланізатары вымушаныя былі сысці з Бірмы. Генерал Аўн Сан шануецца ў М'янме як нацыянальны герой. Дзень 19 ліпеня — нацыянальная жалоба.

Аўн Сан пакінуў запавет: «Сапраўдны шлях для Бірмы — толькі сацыялізм». І М'янма ведала розныя варыянты сацыялізму: ад мааісцкага да будысцкага.

2 сакавіка 1962 у Рангуне адбыўся дзяржаўны пераварот. Хунта на чале з генералам Не Він абвясціла «бірманскі шлях да сацыялізму». Ён працягваўся да 1988 года. У гэтым годзе пачынаюцца студэнцкія хваляванні. Тады ж у краіну вяртаецца дачка нацыянальнага героя Аўн Сан Су Чжы. Яна вучылася ў Індыі, а затым у Оксфардзе. Выйшла замуж за брытанскага навукоўца Майкла Эйрыса. Апаненты яе папракаюць за шлюб з іншаземцам.

Вярнуўшыся на Радзіму, Аўн Сан-малодшая стварае Нацыянальную лігу за дэмакратыю. Ліга перамагае на парламенцкіх выбарах, што не было прызнана хунтай. З таго часу і амаль да сённяшняга дня лідар апазіцыі знаходзілася пад арыштам.

Ці азначае яе вызваленне, што апазіцыя ў М'янме атрымала шанец? Сённяшняя М'янма — клубок праблем. Там месціцца «залаты трохкутнік» сусветнага наркатрафіку. Шматлікія нацыянальныя меншасці — моны, карэны, шаны — дамагаюцца незалежнасці, і іх барацьба аплачваецца грашыма, атрыманымі з вырошчвання маку.



Краіна багатая на радовішчы нафты і газу, але застаецца беднай.

У многіх краінах Азіі да ўлады прыходзілі жанчыны: Індыра Гандзі, Беназір Бхута, Карасон Акіна. Але ў хунты застаюцца сябры ў свеце. Найперш Кітай. М'янму называюць працягам кітайскай правінцый Юнан.

Такім чынам, гаварыць аб надыходзе дэмакратыі ў М'янме рана. Як казаў адзін з дыктатараў з рэгіёна, пакістанскі генерал Аюб-Хан, «дэмакратыя не выжывае ў спякотным клімаце». Што праўда, поспехі Індыі і Тайланда даўно абверглі ягоную заяву.

Улады М'янмы спрабуюць збудаваць «кіраваную дэмакратыю». Нядаўна яны правялі выбары, у якіх удзельнічалі м'янманскія гайдукевічы. У той жа час генералы надзейна кантралююць уладу і СМІ. Грамадства застрашанае пасля разгону «шафранавай рэвалюцыі», якую спрабавалі арганізаваць будысцкія манахі ў 2007-м.

Падзеі, падобныя да беларускай Плошчы 2006-га, скончыліся інакш, чым у Мінску. Вайскоўцы расстралялі дэманстрантаў, і грамадства здранцвела. Перад Аўн Сан стаіць цяжкая задача пераканання грамадства ў магчымасці іншага жыцця.

**Усяслаў Шатэрнік**




# Нашы ў Вільні

**У Вільні, у галоўнай выстаўнай зале Літвы, Цэнтры сучаснага мастацтва, што пры вуліцы Нямецкай (Vokieču, 2), працуе выстава «Дзверы адчыняюцца? Беларускае мастацтва сёння».**

Культурны абмен між Беларуссю і Літвой набыў у апошнія гады незвычайныя формы з-за цяперашняй палітычнай сітуацыі. З аднаго боку — у Вільні і Мінску ладзяцца афіцыйныя выставы на міждзяржаўным узроўні, а з іншага — навязалася безліч прыватных сяброўскіх і творчых кантактаў па-за афіцыёзам. Незалежныя мастакі з беларускага андэграўнду — частыя госці ў Літве. Паўсядзённая рэальнасць Беларусі накладае істотныя абмежаванні, як палітычныя, так і фінансавыя, на нашых мастакоў. А таму мастацтва застаецца надзвычай актуальным, свободным, змушаючы мастакоў пашыраць свае далягляды, вынаходзіць найноўшыя формы, прыдумляць уласную мастакоўскую мову, багатую на мэтафары ды іншасказы.




Выстава «Дзверы адчыняюцца? Беларускае мастацтва сёння» — самая маштабная прэзентацыя беларускіх сучасных мастакоў у Літве. На ёй дэманструюцца працы творцаў, якія жывуць у Беларусі, а таксама беларусаў, што жывуць за мяжой. Можна пабачыць творы Артура Клінава, Аляксандр Камарова, Аляксандра Караблёва, Аляксея Лунёва, Ігара Саўчанкі, Максіма Тымінько, Руслана Вашкевіча, Алега Юшко, Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі...

Праект беларускіх мастакоў у Вільні дае магчымасць беларусам зірнуць на сваё мастацтва збоку, па-за рамкамі звычайных табу. Большасць прадстаўленых працаў так ці інакш закранаюць сённяшнія праблемы беларускага грамадства.

Гэты вялікі фэст быў зладжаны віленскім Цэнтрам сучаснага мастацтва разам з Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам, пры падтрымцы ўрада Літвы і Шведскага агенцтва па міжнародным развіцці.

**СХ**







## СПОРТ

### БАТЭ—Дынама (Кіеў)

**2 снежня (чацвер) у 22.05 на мінскім стадыёне «Дынама»** — матч 5-га тура групавога раўнда Лігі Еўропы. Гуляюць БАТЭ і «Дынама» (Кіеў). Фактычна, гэта будзе гульня за 1-е месца ў групе.

### Хакей: мінчукі супраць навасібірцаў

**30 лістапада (аўторак) на Мінск-Арэне** — хакей (Кантынентальная хакейная ліга). «Дынама» (Мінск) — «Сібір» (Новасібірск). **Пачатак а 19-й.**

### Гандбол, Ліга чэмпіёнаў

**28 лістапада (нядзеля) ў Палацы спорту** — гандбол (Ліга чэмпіёнаў, Групавы этап). «Дынама» (Мінск) — «Кадэтэн» (Швейцарыя). **Пачатак а 16-й.**

## КАНЦЭРТЫ

### Эксклюзіўны канцэрт «Тройцы»

**29 лістапада ў Малой зале к/з «Мінск»** — эксклюзіўны канцэрт этнатрыа «Тройца». **Пачатак а 19-й.** Квіткі каштуюць 40—50 тысяч.

### Neuro Dubel

**2 снежня ў JackClub (вул.Няміга, 12)** зайграе Neuro Dubel. **Пачатак а 21-й.**

### B:N і IQ48 у «Рэактары»

**27 лістапада у «Рэактары» (вул. Харужай, 29)** — супольны канцэрт гуртоў B:N і IQ48. **Пачатак а 18-й.**

### Прыедзе Therion

**30 лістапада на сцэне к/з «Мінск»** — канцэрт шведскага гурта Therion. Гэтыя музыкі лічацца заснавальнікамі стылю сімфа-метал. **Пачатак а 19-й.**

### Алег Хаменка

**24 лістапада ў «Лісінай нары» (вул.Каліноўскага, 32)** зайграе і заспяе лідар гурта «Палац» Алег Хаменка. **Пачатак а 19-й.**

### Альпійскі джаз і беларускія спевы

**25 лістапада ў Маладзёжным тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а)** — канцэрт швейцаркага гурта **Albin Brun Alpin Ensemble** і беларускага **Akana NHS** (праект Русі). **Пачатак а 19-й.**

### Testamentum Terrae

**28 лістапада а 18-й у «Рэактары» (вул.Веры Харужай 29)** гурт сярэдневечнай музыкі **Testamentum Terrae** прэзентуе альбом Angleza. Бяруць таксама ўдзел гурты: **«Рокаш»**, **«Кашлаты Box»**, **«Омут»**.

## ВЫСТАВЫ

### Барыс Забораў

**Да 10 снежня ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** выстаўленыя 38 твораў жывапісу і скульптуры Барыса Заборава. Мастак нарадзіўся ў Мінску ў 1935-м, ад 1981 ён жыве ў Парыжы. Яго называюць беларускім мастаком, а сам Забораў лічыць сябе грамадзянінам сусвету, радзіма якога — Беларусь.

### Няскончаная п'еса для механічнага шыла

**Да 9 студзеня ў Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** працуе выстава швейных машынак «Няскончаная п'еса для механічнага шыла». Вы зможаце даведацца пра асноўных вытворцаў швейных машын XIX—XX стст., убачыць спадарожныя атрыбуты краўцоў (манекены, нажніцы, прасы, тэкстыль мінулых гадоў і інш.), ілюстрацыйны матэрыял па гісторыі моды і рэкламу.

### Юдаль Пэн у Мінску

**У Музеі Якуба Коласа (вул. Акадэмічная, 5) да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку XX стагоддзя.

### Ян Шматлох і вучні

**У Галерэі Акадэміі мастацтваў (вул.Сурганава, 14)** працуе выстава «Ян Шматлох і вучні». На ёй прэзентаваныя творы, выкананыя ў тэхніцы глыбокага друку. Гэтая тэхналогія, што вядзе свой радавод ад сярэднявечнай гравюры, дазваляе ствараць аб'ёмныя, рэльефныя малюнкі.

### З дрэва, гліны і металу

**Да 5 снежня ў Гістарычным музеі** працуе выстава твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «З дрэва, гліны і металу», дзе прадстаўленыя творы трох мастакоў: Андрэя Мяцельскага, Генадзя Саваня, Аляксандра Паўлава. Работы выкананыя з трох непадобных матэрыялаў і ў розных тэхніках — мастацкая кераміка, чаканка і ліццё, а таксама разьба па дрэве.

### Супраць смяротнага пакарання

**Да 11 снежня ў Музеі гісторыі вайны (Кастрычніцкая плошча)** працуе выстава «Смерць — гэта не правасуддзе». Выстава мае на мэце паказаць, што смяротнае пакаранне мусіць быць скасаванае.

## ТЭАТРЫ

**24 лістапада**

**Купалаўскі** — «Офіс»
**Беларускай драматургіі** — «Чайка»

**25 лістапада**

**Беларускай драматургіі** — «Містар Розыгрыш»
**Купалаўскі** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Горкага** — «Ніначка»

**26 лістапада**

**Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Лялек** — «Гісторыя аднаго горада»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Купалаўскі** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Юнага гледача** — «Сіні аўтамабіль»

**27 лістапада**

**Юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Лялек** — «Мыйдадзір»
**Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Горкага** — «Уяўны хворы»
**Купалаўскі** — «Сымон-музыка»
**Беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Оперы і балета** — «Шапеніяна», «Пахіта», «Трыстан і Ізольда»

**28 лістапада**

**Лялек** — «Марынка-крапіўніца»
**Юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Оперы і балета** — «Церам-церамок»
**Горкага** — «Прыбытковае месца»
**Купалаўскі** — «Translations»
**Оперы і балета** — «Шапеніяна», «Пахіта», «Трыстан і Ізольда»

**29 лістапада**

**Купалаўскі** — «Хам»
**Беларускай драматургіі** — «Карусель»
**Оперы і балета** — «Шчаўкунок»

**30 лістапада**

**Юнага гледача** — «Мешчанін у шляхецтве»
**Горкага** — «Панна і смерць»
**Оперы і балета** — «Кармен»

**1 снежня**

**Беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Купалаўскі** — «Старамодная камедыя»

## ФІЛЬМ

# Гары Потэр і Дарункі смерці

**Harry Potter and the Deathly Hallows: Part 1**

Вялікабрытанія, ЗША, 2010, каляровы, 92 хв.

**Рэжысёр:** Дэвід Етс

**Жанр:** прыгоды/фэнтэзі/баявік



У Мінску паказваюць першую частку фінальнага раздзела патэрыяны «Гары Потэр і Дарункі смерці».

Дамблдор памёр: гэта не навіна, а кароткі змест папярэдняй серыі. Добры чараўнік паспеў расказаць Гары Потэру, што самі-ведаеце-каго можна забіць, калі знішчыць хоркруксы — магічныя артэфакты, у якіх знаходзяцца кавалачкі душы Цёмнага валадара. Гары, Герміёна і Рон блукаюць у іх пошуках па свеце, сварачыся і хаваючыся ад Смерцяжэрцаў. Час падціскае: сіла Воландэморта расце — захопленае міністэрства магіі, Хогвартс узначаліў Северус Снэйп.

Пра самыя смелыя навацыі карціны гледачам паведамілі задоўга да яе выхаду: было анансавана, што ў фільме будзе два эпізоды, якіх няма ў кнізе — танец Гары і Герміёны, а таксама раўнівы відзеж Рона, у якім яго сябры паўстаюць у негліжэ.

Рамантычная лінія задае тон усяму фільму. Ужо ў мінулай серыі патэрыяны кроў юных чараўнікоў закіпела ад гармонаў, і барацьба дабра са злом адсунулася на другі план.

Ад выхаду першага фільма пра Гары Потэра прайшло ўжо амаль дзесяць гадоў. За гэты час Потэр паспеў падрасці, і грым ужо не можа замаскіраваць шчэць.

«Дарункі смерці» — адзін з самых страшных фільмаў серыі і мяжуе з дарослым хорарам. Фільм часам ператвараецца ў экшн-баявік, а ў энергічнай сцэне пагоні па Лондане Гары нагадвае ўжо не малога чараўніка, а магічнага Джэймса Бонда.

# Рэха Грунвальда дакацілася да Палінезіі

Манеты да 600-годдзя бітвы выпусцілі не толькі Беларусь і яе суседзі, але Астравы Кука і Палау.

Былая нямецкая калонія Палау адзначыла 600-годдзе знакамітай бітвы выпускам памятных манет. Сваю манету адчаканілі Астравы Кука, паведамляе сайт «Музей грошай».

На манетах Рэспублікі Палау, а іх тры, выяўленыя Вітаўт і Ягайла, польскі рыцар на кані і тэўтонец. Манеты наміналам у адзін даляр, наклад кожнай з іх — 2500 штук. Назва серыі «600 Years Battle Of Grunwald».

Рэспубліка Палау — гэта астраўная дзяржава ў Філіпінскім моры Ціхага акіяна, належыць да Мікранезіі. Выспы былі адкрытыя іспанцамі ў 1543 г. У свой час яны належалі Германіі, пасля знаходзіліся пад патранажам Лігі нацый, ААН. Ад 1994 г. — незалежная краіна.

Астравы Кука выпусцілі манету наміналам у пяць даляраў, агульным накладам 1000 шт. Яна адбітая са срэбра 925-й пробы, мае вагу 25 г. На аверсе манеты партрэт англійскай каралевы Лізаветы II, на рэверсе — польскага караля Ягайлы на фоне бітвы і подпісы «Wladyslaw II Jagiello», «1362—1434», «1410 Battle Of Grunwald». Традыцыйна лічыцца, што Ягайла быў на дзесяць гадоў старэйшы.

Астравы Кука — месцяцца ў паўднёвай частцы Ціхага акіяна ў Палінезіі. З'яўляюцца парламенцкай манархіяй, якая знаходзіцца ў вольнай асацыяцыі з Новай Зеландыяй. Кіраўніком краіны з'яўляецца прадстаўнік каралевы Лізаветы II.

Памятныя манеты да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы выпусцілі і нашчадкі непасрэдных удзельнікаў: Беларусь, Літва, Польшча і Украіна.

### Беларусь

Нацбанк адчаканіў па паўтысячы залатых манет (900-й пробы) наміналам 20 і 50 рублёў, 2500 срэбных 20-рублёвых манет 925-й пробы і 3000 медна-нікелевых 1-рублёвых.

На аверсе залатога 50-рублёвіка, срэбнай і медна-нікелевай манетаў размешчаныя дзяржаўны герб, у цэнтры — стылізаваная выява мяча, якая сваім абрысам нагадвае чалавечую постаць. На адваротным баку манет размешчаная стылізаваная пячатка ў выглядзе адбітка вялікага пальца, у структуры якога намаляваны надпіс «Грунвальдская Бітва» і дата — 1410/07/15. Адбітак пальца выклікаў жарты: маўляў, масавая дактыласкапія дакацілася і да Нацбанка.

На аверсе залатога 20-рублёвіка размешчаная выява дзяржаўнага герба, у цэнтры ў абрамленні вянка з дубовага лісця выявы двух гатычных мячоў. На рэверсе манеты выява чары, увянчанай вянком з дубовага лісця, і дзесяць размешчаных крыжападобна пірамідальных выступаў як памяць аб загінуўшых у Вялікай вайне. Надпісы: у верхняй частцы — Грунвальдская бітва, у ніжняй — 600 год.

### Літва

Літоўцы выпусцілі да юбілею манеты па 500 літаў з золата 999-й пробы (5000 шт.), 50 літаў з срэбра 925-й пробы (10 000 шт.) і 1 літ медна-нікелевага сплаву, фантастычным накладам у 1 000 000. На манетах адлюстраваныя батальныя сцэны, вершнікі і тагачасныя гербы. Надпіс па-літоўску «Грунвальдская бітва» і дата 1410—2010.

### Польшча

У Польшчы выпусцілі манеты двух відаў: авальныя срэбныя (925-й пробы) наміналам 10 злотых — 60 000 штук і круглыя медна-цынкава-алюміневага сплаву наміналам 2 злотыя накладам у 1 400 000 шт. На аверсе авальнай срэбнай манеты — партрэт Ягайлы, «Белы арол» і «Пагоня». На рэверсе — вершнік на фоне батальнай сцэны і надпіс «Грунвальд 1410».


Манеты да 600-годдзя Грунвальда, срэбра, 20 рублёў, Беларусь.


Манеты да 600-годдзя Грунвальда, Палау.


Юбілейная залатая 20-рублёўка. Беларусь.



Манета да 600-годдзя Грунвальда, Выспы Кука.

На двухзлотавіку выява дзяржаўнага герба на аверсе і вяары з гербамі Рэчы Паспалітай і ВКЛ на шчытах на рэверсе. А таксама надпіс: «Grunwald 1410».

**Сямён Печанко**

# Топ-5 тэхнічных прыладаў для сабак і іх гаспадароў

Як патраціць пару тысяч даляраў на чатырохлапага любімца?

Прагрэс няспынна рухаецца наперад, ахопліваючы ўсё новыя сферы жыцця. Цяпер і для звычайнага сабакі на рынку з'явіліся дзясяткі тэхнічных прыладаў. На чатырохлапага ўлюбёнца можна патраціць не адну тысячу даляраў, было б жаданне.

Некаторыя злуюць: маўляў, сабака мусіць быць сабакам! Жыць на вуліцы, чакаць косткі і ганяць катоў. Нязгодныя з імі прэзентавалі свае вынаходніцтвы, каб зрабіць цікавейшым жыццё сабе ці любімаму гадаванцу.

### Сабачае кола

«Сабачнікі» ведаюць, што найбольш часу вымагаюць сумесныя шпацыры з любімай жывёлай. Яны патрэбныя не толькі для таго, каб даць магчымасць схадзіць у туалет не ў кут пакоя, але і каб трымаць сабаку ў тонусе.

Для гаспадароў, якія не маюць часу на гадзінную прабежку, амерыканская кампанія GoPet прыдумала прыладу Tread Wheel — своеасаблівае сабачае кола. Такое самае, як для вавёрак, толькі большае. Праўда, праблему туалета яно не вырашае. Таму гадаванца ўсё ж варта выводзіць на пяць хвілін на двор. А пасля можна садзіць у кола.

Варыянт для маленькіх сабак каштуе каля $350, для большых — каля $850. Такія цэны ўказаныя на сайце амерыканскага вытворцы, але пры з'яўленні попыту кітайскія кампаніі абавязкова выпусцяць танны аналаг.

### Бегавая дарожка

Калі не хапае нерваў глядзець на тое, як гадаванец ледзь стогне, не спраўляючыся з хуткасцю кола, ёсць яшчэ варыянт. За $575 амерыканцы прапануюць спецыяльную бегавую дарожку. Саскочыць з яе нашмат прасцей, чым спыніць кола. А эфект той самы — сабака ў добрай фізічнай форме, а гаспадар не губляе часу на доўгія прагулкі.



Амерыканцы хваляць свой трэнажор: маўляў, хоцы і дарагі, але не робіць шкоды суставам сабак.

### GPS-навігатар

Спецыяльная прылада для сабак, якія гуляюць самі па сабе. Хуліганы, гарадскі рух, пагоня за катом — ці мала для сабакі прычын, каб не знайсці дарогу да роднага пад'езда? А пасля слупы і дзверы пад'ездаў заклейваюцца самотнай аб'явай «Згубіўся»...

Каб гаспадар заўсёды мог даведацца, дзе ягоны сябар, у спецыяльны ашыйнік можна ўставіць сімкартку.

Калі адправіць са смартфона запыт аб месцы знаходжання сабакі, у адказ прыйдзе СМС-паведамленне з указаннем прыблізнага адраса. Значыцца, можна спяшацца на дапамогу. Вось толькі хуліганы могуць паляваць не на сабаку, а на ашыйнік, які каштуе больш за $60... А ўвесь камплект з праграмным забеспячэннем абыдзецца як мінімум у $200.

### Радыёашыйнік

Яго выкарыстоўваюць для дрэсіроўкі. У камплекце ідуць ашыйнік і пульт з дзвюма кнопкамі. Іх прызначэнне простае — папярэдзіць і пакараць. Вытворцы пэўныя, што электраімпульсы прымусяць сабаку задумацца пра свае паводзіны і прывыкнуць да новай каманды. Галоўнае — не перастарацца пры пакаранні. Апаратура каштуе ад $250 і больш.

### Ашыйнік супраць брэху

У вашую адсутнасць сабака проста надрываецца ад брэху? Ці то так сумуе, ці то паказвае, хто ў хаце сапраўдны гаспадар. А часам аж заходзіцца брэхам уначы... Калі суседзі абяцаюць у наступны раз выклікаць міліцыю, можна прадухіліць непрыемную сітуацыю і набыць спецыяльны ашыйнік.

Калі пачынаецца брэх, датчыкі спрацоўваюць на ваганні ў горле і ўздзейнічаюць паўсекундным бяспечным, але непрыемным электрастымуляваннем.

Калі сабака не здаецца, праз тры секунды ўзровень стымулявання павышаецца. І так да пераможнай цішыні. Цана прылады — каля 40 тысяч рублёў.

**Яўген Васількоў**

Сапраўдная беларуская кухня

# Сезон гусей

## Гусь печаная з яблыкамі і падліўкай па-літоўску

1 гусь, соль, 0,5 лыжкі кмену, 2 цыбулі, да 20 дробных і 10 вялікіх яблыкаў, 1 лыжка мукі.

З укормленай гусі зняць залішні тлушч, нацерці яе соллю і кменам зверху і з сярэдзіны, нафаршаваць дробнымі яблыкамі і пячы на бляхе, падсыпаўшы папярэдне прыгаршчамі рэзанай цыбулі і паліваючы спачатку булёнам, а потым сокам, які будзе выцякаць з гусі. Падаючы на стол, абкласці спечанымі асобна яблыкамі, пакласці і тыя, што былі ўсярэдзіне. Соус заправіць лыжкай мукі, моцна закіпяціць і абліць гусь; рэшту соусу падаць у соусніку.

Замест яблыкаў гусь можна нафаршаваць дзеля разнастайнасці тушанай чырвонай капустай.

**НБ**

## Прыватныя абвесткі

**«Я СУМУЮ ПА РАДЗІМЕ»**

**Экскурсія на радзіму Уладзіміра Караткевіча 27—28 лістапада.** З нагоды 80-годдзя Караткевіча запрашаем усіх жадаючых наведаць малую радзіму літаратара — Аршаншчыну. Праграма разлічаная на два дні. У першы дзень запланавана наведванне музея У. Караткевіча, этнаграфічнага музея «Млын», экскурсія па Оршы, знаёмства з гісторыяй Святабагаяўленскага Куцеінскага мужчынскага манастыра, наведванне канцэрта Змітра Вайцюшкевіча. Начлег на беразе Дняпра, на турбазе. У другі дзень чакае наведванне Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка «Ляўкі». Даведкі па т.: (152) 96-91-19, (029) 331-18-83; e-mail: travel@mercana.by.

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Мікола Ермаловіч «Выбранае», Васіль Зуёнак «Выбраныя творы»** — чарговыя кнігі праекта.

**Шукаю дыскі з песнямі** «Янка Купала», «Даставай, Язэп, гармонік», а таксама кнігі М.Ткачова, 1-ю частку «Замкі Беларусі». Т.: (029) 667-39-06. Андрусь.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі

1) У каробцы ляжыць 10 чорных, 3 чырвоных алоўкаў. Якую найбольшую колькасць алоўкаў трэба ўзяць з заплюшчанымі вачыма, каб чорных алоўкаў аказалася не менш за два?

2) Ніна знайшла ў лесе 18 баравікоў, 9 краснюкоў і 8 абабкаў. Дома яна вырашыла аддаць 20 грыбоў для сваёй бабулі. Ці атрымала бабуля хаця б адзін баравік?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

На дзіцячым «Еўрабачанні» перамог хлапчук з Арменіі. Беларус Даніла Казлоў (на фота) стаў пятым. 12 балаў Беларусі аддалі Латвія і Грузія.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# АМОН не стрымаў натоўпу дзяцей

19 лістапада ў мінскім Палацы спорту мусіла адбыцца аўтограф-сесія першай ракеткі свету Каралін Вазняцкі і дзясятай ракеткі свету, беларускі Вікторыі Азаранкі. Калі тэнісісткі выйшлі на корт даваць аўтографы, да іх сталоў хлынуў натоўп дзяцей і падлеткаў.

Тры амонаўцы, што сачылі за парадкам, ці то разгубіліся, ці то абыякава паставіліся да сваіх функцый, аднак арганізаваць дзяцей не змаглі. Ля тэнісістак пачаўся хаос і цісканіна.

Азаранка двойчы заклікала сваіх прыхільнікаў да парадку, але яе было дрэнна чутно за грукатам поп-музыкі. Урэшце тэнісісткі ўсталі і сышлі. Стосы календароў засталіся не падпісаныя.

СМ



«Самая прыгожая міністр свету» Мара Карфанья выйшла з урада Берлусконі, дзе адказвала за роўнасць правоў і магчымасцяў. Кааліцыя Берлусконі рассыпаецца ў выніку скандалаў вакол прэм'ера.



Улады Нью-Ёрка прысудзілі поп-дзіву Пэрыс Хілтан да 200 гадзінаў папраўчых работ за захаванне і ужыванне марыхуаны.



БЕЛТА

У Магілёве ў выніку анамальнага цяпла зацвілі рамонкі. На гэтым тыдні іх занясе снегам.

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

## Анекдоты

* * *

Цэнтрвыбаркам не дазволіць выбаршчыкам сфальсіфікаваць вынікі выбараў.

* * *

— А чаму, калі вам тэлефануюць, вы бераце слухаўку толькі пасля дзесяці званкоў?

— А каб усе яны ведалі, што ў мяне вялікая кватэра!

* * *

Дакладная вага кілаграма залежыць ад кваліфікацыі і досведу работніка гандлю.

* * *

Нішто так не дысцыплінуе кіроўцу на зімовай вуліцы, як новы «Паршэ Каен», што едзе наперадзе.

* * *

Чаму ў савецкія часы спачатку ўсё ішлі анекдоты пра Васіля Іванавіча, а потым рэзка пайшлі анекдоты пра чукчаў? Адказ просты: тыя, хто складалі анекдоты пра Чапаева, вярнуліся з Чукоткі...

* * *

— Купіш слана?

— Навошта ён мне? Куды я яго падзену?

Ён жа такі вялізарны! Есць многа, як яго карміць?

— А двух за тую ж цану?

— Вядзі!

## «НН» сто гадоў з вамі

**Ясная Паляна.** Вядомы расійскі пісьменнік Л.М.Талстой раптоўна выехаў з дому, няма ведама куды. Ходзяць чуткі, быццам Талстой выехаў, каб на пустыні адзінока дажываць веку свайго.

**«НН». №44—45. 1910.**

**Сапраўднай сенсацыяй сталася заява Тамары Рохлінай,** удавы забітага ў 1998 г. расейскага генерала, пра тое, што Лукашэнка даваў яе мужу грошы на падрыхтоўку масавага выступу сілавікоў супраць Ельцына. Выступаючы 15 лістапада ў гарадскім судзе Нара-Фамінска, Тамара Рохліна сказала, што яе муж рыхтаваў вялікую антыельцынскую акцыю, пра якую было ведама Генадзю Зюганаву, Віктару Ілюхіну, Альберту Макашову ды Аляксандру Лукашэнку. Апошні, калі верыць яе словам, забяспечваў як маральную, так і фінансавую падтрымку.

**«НН». №47. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) 5; 2) Так.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф–рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.
**Наклад 6420.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 23.11.2010.
Замова № 5698.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10044